ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 45 (5051) 22 лістапада 2019 г. ISSN 0024-4686

16+

Шляхоў перасячэнне... стар. 4

Паэт-наратар, паэт-назіральнік стар. 7

«Лістапад-2019»: воблака інтрыгі стар. 14

Драма мовай танца

«Ганна Карэніна» ўпершыню ў рэпертуары Вялікага

Фота Ганны Занкавіч.

Балетная прэм'ера сезона! Класіка сусветнай літаратуры на галоўнай беларускай сцэне: «Ганна Карэніна» ўпершыню ў рэпертуары Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.

Сусветна вядомы раман Талстога і геніяльная музыка Чайкоўскага. Для балетмайстра-пастаноўшчыка гэта вялікая адказнасць — расказаць трагічны сюжэт знанага аўтара ў музычным суправаджэнні шэдэўра сімфанічнага мастацтва. Вольга Костэль замахнулася на манументальнае палатно і вырашыла паказаць драму мовай танца з новага боку. Паставіць Ганну Карэніну на пуанты асабліва няпроста пасля балета Шчадрына з непаўторнай Маяй Плісецкай у галоўнай ролі. Але менавіта так атрымліваюцца пастаноўкі, якія ўваходзяць у гісторыю.

Увасобіў у жыццё ідэю разам з Вольгай Костэль дырыжор-пастаноўшчык Андрэй Галанаў. Паводле яго слоў, музыка Чайкоўскага перадае шматграннасць рускай душы. А адначасовае напісанне і рамана, і музыкі як нельга лепш адлюстроўваюць сітуацыю і канфлікт таго часу.

Працяг на стар. 13

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 19045

акцэнты тыдня

Векапомнае. Прэзентацыя першага выпуску серыі мультымедыйных выданняў «Партызанскі архіў» — электроннага дакументальнага выдання «Аператыўныя і выведвальныя зводкі Беларускага штаба партызанскага руху: 1944 год» — адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Выданне прымеркавана да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта сумесны праект Нацыянальнага архіва Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкі. У зборніку апублікавана 100 дакументаў Беларускага штаба партызанскага руху з фондаў Нацыянальнага архіва. Выданне забяспечана ілюстрацыйным блокам і неабходнай навукова-даведачнай інфармацыяй.

Юбілей. Вядучы педагагічны ўніверсітэт Беларусі адзначае сваё 105-годдзе, паведамілі ў прэс-службе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. БДПУ імя М.Танка з'яўляецца галоўнай вышэйшай навучальнай установай Беларусі ў галіне бесперапыннай падрыхтоўкі педагагічных кадраў. У структуру ВНУ ўваходзяць тры інстытуты, дзесяць факультэтаў, аспірантура і дактарантура. Цяпер ва ўніверсітэце навучаюцца больш чым 14 тыс. чалавек, 1350 з якіх — замежнікі з 22 краін свету. За ўсе гады існавання педуніверсітэта падрыхтавана каля 180 тыс. настаўнікаў — з іх больш як 500 заслужаных настаўнікаў і дзеячаў навукі, звыш 100 дактароў і 1,5 тыс. кандыдатаў навук, больш чым 100 пісьменнікаў.

Нацпрэмія. Рэспубліканскі конкурс «Нацыянальная прэмія ў галіне выяўленчага мастацтва» праводзіцца з 1 лістапада па 15 лютага, паведамляе Міністэрства культуры. Дырэкцыяй конкурсу вызначаны Нацыянальны гістарычны музей Беларусі. Спаборніцтва праводзіцца па 10 намінацыях: «Жывапіс», «Графіка», «Скульптура», «Дызайн», «Актуальнае мастацтва» (арт-аб'ект, інсталяцыя), «Мастацкая фатаграфія», «Манументальнае і манументальна-дэкаратыўнае мастацтва», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Мастацтвазнаўства і крытыка», «Творчы дэбют». Камісіяй будзе адабрана па 10 работ у кожнай намінацыі для ўдзелу ў Рэспубліканскай выстаўцы сучаснага выяўленчага мастацтва.

Рэліквіі. Агульнабудаўнічыя работы першай чаргі рэканструкцыі Старога замка ў Гродне плануецца завяршыць да лета 2020 года, паведамляе БелТА. Рэканструкцыя аднаго з найстарэйшых замкаў Беларусі пачалася ў 2017 годзе, вядзецца згодна з праектам Уладзіміра Бачкова. У Гродне плануюць аднавіць замак XVI стагоддзя такім, якім ён быў у часы Стэфана Баторыя. Рэканструкцыя суправаджаецца маштабнымі археалагічнымі даследаваннямі. З пачатку рэстаўрацыі замка знойдзена больш як 3 тыс. артэфактаў, сярод якіх — сярэдневяковыя ўпрыгажэнні, шахматныя фігуры, гандлёвыя пячаткі. Знойдзены і элементы сярэдневяковай забудовы Замкавай гары, умацаванні розных эпох.

Стасункі. Мастацкі праект, прымеркаваны да 25-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Грузіяй, адкрыўся гэтымі днямі ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Арганізаваны ўстановай сумесна з Пасольствам Грузіі ў Рэспубліцы Беларусь. Экспазіцыя прадстаўляе карціны адных з найлепшых прадстаўнікоў сучаснага беларускага і грузінскага жывапісу ва ўсёй шматграннасці кірункаў, жанраў, тэхнік і выяў. Тут можна пабачыць творы Валянціна Губарава, Сяргея Рымашэўскага і Андрэя Смаляка — з беларускага боку. Грузінскі бок прадстаўлены такімі мастакамі, як Леанід Данэлія, Тамара Матвеенка-Батакова, Кахабер Гагохія.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

стасункі

Крысціна ЮХАНЕСАН:

«Мы ўражаны цікаўнасцю беларускіх кнігавыдаўцоў да шведскай літаратуры

У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь адбылася рабочая сустрэча з паслом Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь спадарыняй Крысцінай Юханесан. Размова ў асноўным ішла пра супрацоўніцтва Беларусі і Швецыі ў гуманітарнай сферы.

Варта зазначыць, што ў апошнія 20—25 гадоў у Мінску выдадзена на рускай і беларускай мовах болей як 400 кніг шведскіх аўтараў. Безумоўным лідарам з'яўляецца дзіцячая літаратура паўночнай краіны. Гэтаму, несумненна, спрыяюць памкненні пасольства шырэй прадстаўляць свае культуру і літаратуру.

«Браты Львінае сэрца», «Малы і Карлсан-з-даху» — кнігі Астрыд Ліндгрэн, перакладзеныя на беларускую мову і выдадзеныя яшчэ ў «Юнацтве», а таксама Выдаўцом Зміцерам Коласам. «Літаратура і Мастацтва», Выдавец Зміцер Колас, «Мастацкая літаратура», «Кнігазбор» і іншыя выдавецтвы спрычыніліся да выдання на беларускай мове кніг шведскіх пісьменнікаў Ю. Вісландэр, С. Нурдквіста, Г. Бэргстрэма, Л. Андэрсан… А сёння ў краіне працуе Выдавец Надзея Кандрусевіч (такая назва ў выдавецтва, якое ўзначальвае аўтарытэтная перакладчыца са шведскай мовы спадарыня Надзея Кандрусевіч), якое спецыялізуецца на выданні кніг шведскіх літаратараў па-беларуску.

Міністр інфармацыі краіны Аляксандр Карлюкевіч запрасіў кіраўніка шведскага пасольства да актыўнага ўдзелу ў маючай адбыцца ў лютым 2020 года чарговай Мінскай кніжнай выстаўцы-кірмашу. Былі абмеркаваны і тэмы выдання беларускай мастацкай літаратуры ў Стакгольме ў перакладзе на шведскую мову.

Сяргей ШЫЧКО

праекты

Літаратурныя спатканні на Мальце

Пытанні ўзаемных перакладаў і стварэння сумесных выдавецкіх праектаў сталі ключавымі для беларускіх выдаўцоў, якія ўпершыню наведалі Мальтыйскі міжнародны кніжны фестываль.

Так, прадстаўнікі айчыннай дэлегацыі абмеркавалі пытанні падчас сустрэчы са старшым менеджарам Нацыянальнага кніжнага савета Мальты Сімонай Касана. Як вынік — вядуцца перамовы па выпуску кнігі мальтыйскіх казак у выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» (серыя «Казкі народаў свету»).

Ад Беларусі Мальтыйскі фестываль наведалі рэферэнт упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Вікторыя Лукашутэ і дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Вольга Ваніна, якія запрасілі літаратараў краіны на Мінскую міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш і міжнародны сімпозіум «Пісьменнік і час». У якасці кандыдатуры ўдзельніка мальтыйскі бок прапанаваў пераможцу Нацыянальнай літаратурнай прэміі Мальты Ларан Велу.

У экспазіцыі было прадстаўлена каля 20 айчынных выданняў. Нашы кнігі «Янка Купала. "А хто там ідзе?" на мовах свету», «Францыск Скарына на мовах народаў свету», «"Мая залатая Бенгалія" на мовах народаў свету» выклікалі вялікую цікавасць. Прэзентавалі і выданні, якія распавядаюць пра Беларусь і яе культуру.

Як адзначылі ўдзельнікі дэлегацыі, на Мальце таксама нямала прэзентацыйнай літаратуры пра краіну. Аднак кнігі каштуюць нятанна: робіцца акцэнт не толькі на тэкст, але і на яркае афармленне. Распавялі выдаўцы і пра цікавостку кніжных крам Мальты: кнігі на паліцах размешчаны не толькі па жанрах і тэматыцы, але і ў залежнасці ад запатрабаванасці. Дарэчы, на Мальце ёсць некалькі фондаў, якія падтрымліваюць выданне літаратуры, у тым ліку перакладной. З падтрымкай аднаго з іх ёсць магчымасць зладзіць яшчэ адзін сумесны праект. Да таго ж у краіне заўважны працэнт тых, хто размаўляе на рускай мове, таму патэнцыял перакладных праектаў відавочны.

Падводзячы вынікі ўдзелу ў фестывалі падчас прэс-канферэнцыі ў прэс-цэнтры Дома прэсы, Вікторыя Лукашутэ адзначыла:

— Наша зацікаўленасць — вывучэнне досведу. Для мяне як для аднаго з арганізатараў Мінскай кніжнай выстаўкі важна было прасачыць, якія асаблівасці мае гэты кніжны фестываль. Знайшлося і тое, што можна рэалізаваць у нас. Але пакуль гэта на ўзроўні ідэй.

У сёлетнім Мальтыйскім міжнародным кніжным фестывалі, які праводзіцца з 1979 года ў розных фарматах, паўдзельнічалі выдаўцы, пісьменнікі і перакладчыкі з Францыі, Ірландыі, Швецыі, Вялікабрытаніі, Бельгіі, Германіі, Іспаніі, Мальты. Беларусь — адзіная краіна, якая прадстаўляла СНД. На працягу пяці дзён на розных пляцоўках прайшлі прэзентацыі, аўтограф-сесіі, семінары і канферэнцыі, у тым ліку «Хуткія літаратурныя спатканні», якія дазволілі сустрэцца з выдаўцамі, пісьменнікамі і ілюстратарамі сам-насам.

Яўгенія ШЫЦЬКА

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Навігатар у кніжным свеце

Па выніках літаратурнай дзейнасці Саюз пісьменнікаў Беларусі падрыхтуе дайджэст найлепшых твораў сяброў арганізацыі.

Досвед двух папярэдніх выпускаў паказаў важнасць аналізу творчых набыткаў і прапаганды найлепшых выданняў ды іх аўтараў.

Дайджэст мае шырокае поле распаўсюджвання: пачынаючы ад дзяржаўных устаноў да бібліятэк і кнігарняў. З'яднаныя пад адной вокладкай назвы кніжных навінак і іх анатацыі прызначаны для ўсіх, хто цікавіцца сучасным літаратурным працэсам. Гэта своеасаблівы навігатар у вялікім кніжным свеце.

Для больш аб'ектыўнай ацэнкі новых выданняў сёлета ў СПБ створаны экспертны савет, па выніках работы якога і будзе прынята рашэнне аб змесце дайджэста. Старшынёй савета абраны дырэктар інстытута літаратуразнаўства імя Я. Купалы НАН Беларусі Іван Саверчанка. У склад савета ўвайшлі старшыні вядучых творчых секцый СПБ, прадстаўнікі абласных аддзяленняў, Міністэрства адукацыі і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага педуніверсітэта імя М. Танка.

Стануць вядомыя тэндэнцыі развіцця сучаснага літаратурнага працэсу. Будзе ацэнена праца выдавецтваў.

Звесткі пра кнігі, выдадзеныя ў гэтым годзе, можна падаць у Саюз пісьменнікаў Беларусі да 1 снежня.

Марыя ЛІПЕНЬ

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

25 лістапада *— на імпрэзу з удзелам Аляксандра Вашчанкі і Іны Фраловай у літаратурную гасцёўню «Верасок» у дзіцячай бібліятэцы № 16 (14.00).*

25 лістапада *— на пасяджэнне студыі юных літаратараў «Малінаўскія галасы» ў дзіцячай бібліятэцы № 15 (16.00).*

26 лістапада *— на імпрэзу ў літаратурную студыю «Вобраз» у СШ № 168 (14.00).*

26 лістапада *— на свята паэзіі і песні з удзелам Навума Гальпяровіча, Міхася Пазнякова, Валянціны Паліканінай і спевака Віктара Мяцельскага ў Палац культуры г. Пінска (18.00).*

26 лістапада *— на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Аўтограф» у інтэрнат № 8 пры БДЭУ (19.00).*

27 лістапада *— на сустрэчу з Лізаветай Палеес у СШ № 53 (13.40).*

27 лістапада *— на сустрэчу з Наталляй Батраковай у літаратурны клуб «Шчырасць» пры бібліятэцы № 22 (16.00).*

27 лістапада *— на сустрэчу з кампазітарам Эдуардам Ханком у Тэатр паэзіі пры Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Янкі Купалы (17.30).*

29 лістапада *— на імпрэзу «Раскрываецца сэрца, святлее душа...» у літаратурны клуб «Творчыя сустрэчы» пры бібліятэцы № 8 імя М. Багдановіча (11.00).*

29 лістапада *— на прэзентацыю кнігі Міколы Адама «...І прыдбаў гэты дом» у Цэнтральную гарадскую бібліятэку імя Я. Купалы (17.00).*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

26 лістапада *— на ўрачыстую цырымонію ўручэння абласной літаратурнай прэміі аблвыканкама імя У. Калесніка ў актавую залу Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна (14.00).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

25 лістапада *— на сустрэчу з Пятром Буганавым у літаратурна-музычную гасцёўню «Под сенью духовности» ў бібліятэку № 3 імя Янкі Купалы г. Полацка (17.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

26 лістапада *— на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Магія слова» ў Магілёўскую абласную бібліятэку імя У. І. Леніна (17.30).*

26 лістапада *— на прэзентацыю кнігі Святланы Ластачкінай «Вера стварае рэальнасць» у Палац культуры Белдзяржсельгасакадэміі (18.00).*

27 лістапада *— на імпрэзу па творчасці Ніны Кавалёвай «Край мой крыніцы» ў Белдзяржсельгасакадэмію (г. Горкі, вул. Сурганава, 4) (19.00).*

28 лістапада *— на прэзентацыю кнігі Міколы Падабеда «Сонца сярод ночы» ў МДУ імя А. А. Куляшова (аўд. 353) (16.00).*

форум

Прастора даверу

Беларусь узяла ўдзел у VIII Санкт-Пецярбургскім культурным форуме

Пра нашу краіну тут казалі шмат. Так, напрыклад, з Мінска ў Піцер прыехала знакавая выстаўка з Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі «Майсей Напельбаум. Партрэт эпохі», а на міжнароднай канферэнцыі «Культурныя маршруты славянскага свету на карце Еўропы» былі агучаны беларускія прынцыпы пабудовы тых самых культурных маршрутаў.

Сёлета пляцоўка VIII Санкт-Пецярбургскага культурнага форуму ў поўным сэнсе выступіла прасторай даверу і шматфункцыянальнай камунікацыйнай платформай, якая сабрала лідараў меркаванняў і экспертаў, дзеячаў культуры, прадстаўнікоў органаў улады, бізнесу, міжнародных прафесійных і грамадскіх арганізацый, журналістаў, забяспечыла ўмовы для рэалізацыі новых праектаў у культуры. Асноўная тэма форуму — «Культурныя коды ва ўмовах глабалізацыі». Форум традыцыйна працаваў адначасова ў трох кірунках: прафесійным, дзелавым і грамадскім.

Канферэнцыя «Культурныя маршруты славянскага свету на карце Еўропы» — адна з найважнейшых частак форуму. Сама праграма «Культурныя маршруты» была прынята Саветам Еўропы ў 1987 годзе для захавання спадчыны і разнастайнасці розных краін, прасоўвання ідэі культурных абменаў. Сумесныя маршруты выступаюць у якасці каналаў для міжнароднага дыялогу і садзейнічаюць пашырэнню ведаў аб Еўрапейскай культурнай ідэнтычнасці.

— Культура і духоўная спадчына Беларусі адыгрываюць важную ролю ў фарміраванні і ўмацаванні культурнай ідэнтычнасці Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, — падкрэсліў падчас канферэнцыі міністр культуры Беларусі Юрый Бондар. — У краіне шмат робіцца ў кірунку рэстаўрацыі і аднаўлення гісторыка-культурнай спадчыны. Мы актыўна супрацоўнічаем з Латвіяй, Літвой, Польшчай, Расіяй і Украінай. Дзяржава не словам, а справай даказвае сваю прыхільнасць і далей заставацца своеасаблівым культурным мостам у Еўропе, важнай пляцоўкай не толькі палітычнага, але і міжкультурнага дыялогу.

Міністр культуры таксама адзначыў, што Беларусь валодае значным патэнцыялам у справе ўзбагачэння рэгіянальнага міжкультурнага супрацоўніцтва. Сёння ў краіне налічваецца больш чым 15 тысяч аб'ектаў, якія маюць гістарычнае, культурнае і мастацкае значэнне, 5,5 тысячы з іх уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. На тэрыторыі краіны таксама знаходзіцца вялікая колькасць памятных месцаў, звязаных з імёнамі выдатных дзеячаў сусветнай гісторыі і культуры, такіх, у прыватнасці, як Сімяон Полацкі, Адам Міцкевіч, Фёдар Дастаеўскі, Марк Шагал, Надзя Лежэ, Казімір Малевіч.

Вікторыя АСКЕРА

да ведама

Ад Коласа да… Кінга

Публіцыстычны праект «Запрашаем у кнігарню», у якім пойдзе размова пра кнігу ўспамінаў краязнаўцы Уладзіміра Содаля і пра выданне «Масюкоўшчына. Трагедыя савецкіх ваеннапалонных», радыёканал «Культура» прапануе да ўвагі слухачоў на гэтым тыдні. Асобнае месца ў праграме зойме расповед пра матэрыялы штотыднёвіка «ЛіМ». Будуць праанансаваныя літаратурныя старонкі выдання.

Таксама да канца тыдня выйдзе праграма «Кнігалюбу», дзе будзе гаворка пра навінкі выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Для аматараў паэзіі прагучаць вершы Уладзіміра Марука, Алеся Звонка і Валянціны Коўтун у праграмах «Паэзія XXI стагоддзя» і «Пэтычная раніца». На пачатку наступнага тыдня цікава будзе паслухаць і радыёверсію тэлепраграмы «Суразмоўцы», у якой адбудзецца гутарка з паэтэсай Таццянай Сівец. Штодзень да ўвагі прыхільнікаў прозы рыхтуецца праграмы «Літаратурная анталогія» і «Радыёбібліятэка». Гэтым разам у ёй прагучыць аповесць Васіля Быкава «Знак бяды» ў выкананні Лікі Пташук, а таксама творы Людмілы Рублеўскай «Сэрца мармуровага анёла» і «Пярсцёнак апошняга імператара» . Да ўвагі слухачоў прапануюцца і навелы Янкі Брыля са зборніка «Сцежкі. Дарогі. Прастор» у межах перадачы «Літаратурныя гісторыі», апавяданні Якуба Коласа «Хмарка» і Івана Стадольніка «Перад вяселлем».

Выйдзе праграма «Радыётэатр. Лепшае» (да 100-годдзя Купалаўскага тэатра), у якой прагучыць радыёкампазіцыя спектакля Купалаўскага тэатра «Простая дзяўчына» па аднайменнай п'есе Канстанціна Губарэвіча. Аматары творчасці Стывена Кінга маюць магчымасць паслухаць радыёспектакль па яго творы «Здольны вучань» у праграме «Радыётэатр плюс».

З праграмай радыёперадач можна азнаёміцца на сайце Белтэлерадыёкампаніі і канала «Культура».

Фантазія, якая нараджае прыгажосць

Месцам, дзе сустрэліся Усход і Захад, стала камерная зала Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Там прэзентавалі выстаўку твораў усходняга і заходнееўрапейскага мастацтва з калекцыі князёў Дандуковых-Карсаковых. Назва выстаўкі «Усход — Захад» адлюстроўвае ўнікальнасць праекта: узоры мастацтва, створаныя ў Італіі, на Каралеўскай мануфактуры ў Мейсне ў Германіі, дзе паўстаюць сюжэты старажытнагрэчаскай міфалогіі, суседнічаюць са скульптуркамі адмысловых бажкоў і выкшталцоным посудам з кітайскіх правінцый, а таксама маляўнічымі палотнамі, якія некалі ўпрыгожвалі княжаскі маёнтак.

Кітайская ваза XVIII ст.

Экспанаты, прадстаўленыя на выстаўцы, сведчаць аб гісторыі фарміравання музейнага збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Беларускі дзяржаўны музей (на аснове якога і створана сучасная ўстанова), адкрыты ў 1923 г., наследаваў гістарычныя артэфакты, сабраныя ў Мінскім царкоўна-археалагічным музеі і Мінскім абласным музеі. У 1920-я гады ў фонды музея трапіла маёмасць палацаў і сядзіб, мэбля, посуд, зброя, побытавыя рэчы. З багатай калекцыі князёў Дандуковых-Карсаковых, якая ў XIX ст. налічвала каля трох соцень жывапісных твораў і помнікаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва XVI—XIX стст., захавалася няшмат: падчас вайны яна была эвакуіравана, пасля чаго частка рэчаў трапіла ў Смаленск (у асноўным гэта карціны), іншая частка — у гістарычны музей. Але большасць твораў мастацтва згубілася...

З найбольш рэдкіх прадметаў для музейных збораў Беларусі — посуд, аздоблены распіснымі паліхромнымі эмалямі, фарфоравыя вазы, разныя каменныя скульптуры з Кітая XVI—XVII стст. Старадаўнія майстры ператваралі ў мастацтва побытавыя рэчы: адмысловае дэкарыраванне ваз, талерак, чайнікаў прадуманымі сюжэтамі захапляе, прымушаючы спыняцца на кожнай дэталі, сачыць за развіццём падзей на карцінках: многія з іх не статычныя, а ў руху. Напрыклад, жанчына, якая пільна назірае за гульнёй малых хлопчыкаў; фазаны, якія імкліва ляцяць... Рух душы мастака не абмяжоўваўся: пэндзаль нараджаў цудоўныя малюнкі, вартыя ўпрыгожыць каралеўскія палацы... Тэхнікі роспісу адрозніваліся: роспіс, зроблены спецыяльнымі фарбамі, мог быць і надглазурным, і падглазурным.

Прадметы, прадстаўленыя на выстаўцы, якая з'яўляецца вынікам творчага супрацоўніцтва Нацыянальнага гістарычнага музея і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, аўтэнтычныя. Большасць іх экспануецца ўпершыню. Выстаўка чакае наведвальнікаў да 12 студзеня 2020 года.

Яна БУДОВІЧ, фота аўтара

ЛіМ КАЛЯНДАР

23 лістапада — 195 гадоў з дня нараджэння Баляслава Міхаіла Юлія Русецкага (1824—1913), мастака, графіка.

23 лістапада — 110 гадоў з дня нараджэння Сяргея Бульчыка (1909—1996), народнага артыста БССР.

23 лістапада 80 гадоў спаўняецца Леніне Сіваковай, майстру дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва (ручное ткацтва).

24 лістапада — 120 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Ганчарыка (1899—1986), заслужанага дзеяча навукі БССР.

25 лістапада — 135 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Кудрэвіча (1884—1957), заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

25 лістапада — 100 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Міцкевіча (1919—2002), літаратуразнаўца, крытыка.

25 лістапада — 85 гадоў з дня нараджэння Леаніда Падгайскага (1934—1980), мовазнаўца.

25 лістапада 60-гадовы юбілей святкуе Ігар Рымашэўскі, майстар манументальна-дэкаратыўнага і ўжытковага мастацтва.

26 лістапада — 100 гадоў з дня нараджэння Івана Скарынкіна (1919—2010), празаіка.

27 лістапада — 135 гадоў з дня нараджэння Дзмітрыя Басалыгі (1884—1969), дзеяча тэатра і кінамастацтва.

27 лістапада — 115 гадоў з дня нараджэння Мікалая Звездачотава (1904—1985), народнага артыста БССР.

28 лістапада — 110 гадоў з дня нараджэння Іосіфа Вейняровіча (1909—1998), народнага артыста БССР.

28 лістапада — 105 гадоў з дня нараджэння Анатоля Іванова (1914—1996), празаіка.

28 лістапада — 95 гадоў з дня нараджэння Барыса Сарахатунава (1924—2018), рэжысёра дакументальнага кіно.

28 лістапада 75-годдзе адзначае Рыгор Сарока, дырыжор, педагог, заслужаны работнік культуры БССР.

29 лістапада — 160 гадоў з дня нараджэння Мікалая Янчука (1859—1921), вучонага-славіста, драматурга, паэта, музыказнаўца, кампазітара.

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2020 г.

«ЛіМ»	1 месяц	падпісны індэкс
Для індывідуальных падпісчыкаў	7 р. 63 к.	63856
Ведамасная падпіска	20 р. 77 к.	638562
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў	5 р. 34 к.	63815
Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі	15 р. 79 к.	63880

люстэрка тыдня

Філалагічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава праводзіць фестываль беларускага слова, паведаміла БелТА. Форум прысвечаны роднай мове, культуры і традыцыям. У пачатку лістапада стартавала чэлендж-эстафета ў *Instagram*. Выкладчыкі і студэнты пад хэштэгам #вершыфлф публікуюць відэа, дзе яны чытаюць беларускамоўную паэзію. Арганізатары форуму прапануюць гасцям музычныя і інтэрактыўныя спектаклі, прэзентацыі альманаха цэнтра славянскіх моў і культур. Не менш цікавыя падзеі фэсту — рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце», конкурс перакладчыкаў, конкурс беларускай песні, пасяджэнне клуба «Размаўляй».

Літаратурны музей Петруся Броўкі прапанаваў гасцям імпрэзу «Не папракай мяне ў няшчырасці…», прысвечаную 120-годдзю з дня нараджэння Міхася Клімковіча, арганізатара народнай школы на Лагойшчыне, старшыні аргкамітэта па стварэнні Саюза пісьменнікаў БССР, а пасля і першага яго кіраўніка. Літаратурна-крытычныя працы Міхася Клімковіча адпавядалі духу савецкай эпохі, але і маглі ратаваць творы ад занядбання. Ён быў аўтарам апавяданняў, драматургічных твораў, стваральнікам лібрэта да опер. Арганізатары імпрэзы мелі намер раскрыць аўтара гімна як шматгранную асобу: пачуць успаміны родных, аднавіць гістарычны кантэкст жыцця і працы літаратара.

Расійская ваенная драма «Ржэў» выйдзе ў пракат 5 снежня, інфармуе РІА «Новости». Рэжысёр Ігар Капылоў напісаў сцэнарый па аповесці Вячаслава Кандрацьева «Загладзіць крывёй». Дзеянне карціны адбываецца падчас бітвы пад Ржэвам у лютым 1942 года. Рота байцоў выбівае немцаў з сяла Аўсяннікава. У баях загінула больш чым палова нашых. Тыя, што засталіся ў жывых, трымаюць абарону і чакаюць падмацавання, але замест яго да іх пад агнём прабіваецца толькі малодшы лейтэнант — начальнік асобага аддзела. Яго задача — выявіць здраднікаў сярод сваіх… Стужка створана на студыі «Триикс медиа» пры інфармацыйнай падтрымцы тэлеканала «Расія 1».

У Азербайджане, у Цэнтры Гейдара Аліева, адкрылася персанальная выстаўка «Паслядоўнік авангарда. Азербайджанскі дзённік» класіка савецкай фатаграфіі Якава Халіпа. Як паведамляе АЗЕРТАДЖ, выстаўка арганізавана сумесна з Цэнтрам фатаграфіі імя братоў Люм'ер у Маскве. У экспазіцыі прадстаўлена калекцыя з больш як 100 цікавых фатаграфій, створаных у 1930—1960-х гадах. Побач з работамі Якава Халіпа, якія лічацца класікай савецкага фотамастацтва, упершыню дэманструюцца і работы, створаныя ў Азербайджане. На выстаўцы прадстаўлены экспанаты з сямейнага архіва Якава Халіпа, а таксама розныя дакументы, тэлеграмы, паштоўкі 1930-х гадоў, рэдкія кнігі, часопісы, альбомы, ілюстраваныя фатаграфіямі выбітнага майстра.

Аўкцыённы дом *Sotheby's*, што ў Францыі, выставіў на таргі дакладную копію карціны Леанарда Да Вінчы «Мона Ліза», паведамляе БелТА са спасылкай на *Euronews*. Палатно было намалявана ў XVII стагоддзі невядомым майстрам. Адзначаецца, што ўладальнік копіі «Джаконды» бельгіец Вім Дэльвуа набыў яе ў 2010 годзе за 35 тыс. еўра. У XVI—XIX стагоддзях было створана каля 150 копій знакамітай карціны Леанарда да Вінчы. Сярод мастакоў, якія капіравалі «Джаконду», — такія вядомыя майстры, як Тыцыян, Рафаэль і Рэмбрант. Для мастакоў стварэнне копіі з'яўлялася спосабам навучання майстэрству і магчымасцю зразумець, як тварылі іх папярэднікі.

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

ПАДАРОЖЖА Ў НЕКАЛЬКІ КРОКАЎ

Асаблівасці XIII абласнога фестывалю нацыянальных культур у Маладзечне

Развіццё патэнцыялу культуры — важная задача для любога грамадства. Кожная культурная традыцыя — магчымасць зразумець асаблівасці функцыянавання жыцця народа, яго ўклад. Сёлета шляхі нацыянальных культур зноў перасякліся ў Маладзечне: у выхадныя прайшоў XIII абласны фестываль нацыянальных культур, дзе генерыраваліся цікавыя і крэатыўныя ідэі сучаснага пазіцыянавання культуры. На гэты раз Мінская вобласць аб'яднала прадстаўнікоў 13 краін, для якіх Беларусь стала другім домам.

Фестываль прайшоў у гарадскім Палацы культуры. Звычайна яго называюць святам адзінства, дружбы і згоды. Кожны з удзельнікаў сваім талентам, творчасцю ўзбагачае не толькі самабытную культуру, але і ў цэлым культуру Беларусі. Штогод фэст праводзіцца ў мэтах гарманізацыі міжнацыянальных адносін, папулярызацыі найлепшых узораў паэтычнага, музычнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва нацыянальных супольнасцей вобласці, для даследавання пераемнасці нацыянальных мастацкіх традыцый, умацавання творчых і дзелавых адносін паміж установамі культуры і грамадскімі культурна-асветніцкімі арганізацыямі нацыянальных супольнасцей.

Абласное свята адкрыла выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў фае Палаца культуры. Яна стала вынікам карпатлівай і натхнёнай працы майстроў. Удзельнікаў узнагародзілі адмысловымі дыпломамі ў розных творчых намінацыях і каштоўнымі падарункамі. З віншавальнай прамовай да мікрафону была запрошана дырэктар Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці Раіса Вайцяхоўская, якая ўручыла дыпломы за падтрымку і развіццё нацыянальных культурных традыцый, за развіццё і пераемнасць мастацкіх традыцый рамяства, за ўмацаванне творчых адносін паміж установамі культуры і грамадскімі арганізацыямі нацыянальных супольнасцей, а таксама за захаванне і пераемнасць нацыянальных кулінарных традыцый, прапаганду нацыянальнай літаратуры і шматгадовы ўдзел у Абласным фестывалі нацыянальных культур.

Гасцей парадавала канцэртная праграма «Скарбы нацый — спадчына зямлі». Гледачоў чакалі парад прадстаўнікоў нацыянальных дыяспар, танцавальныя і вакальныя нумары. На свята прыехалі майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, творчыя калектывы грамадскіх нацыянальных аб'яднанняў і індывідуальныя выканаўцы з розных рэгіёнаў Міншчыны. Сярод іх — удзельнікі культурна-асветніцкага аб'яднання ўкраінцаў «Краяны» (г. Маладзечна) і культурна-асветніцкага аб'яднання ўкраінцаў «Обрий» (Мінскі раён), Беларускага грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Ватра», народнага аматарскага аб'яднання прадстаўнікоў нацыянальных культур «Шматгалоссе» Печынскага гарадскога Дома культуры Барысаўскага раёна, культурна-асветніцкага грамадскага аб'яднання «Саюз палякаў на Беларусі» з Нясвіжа, Стоўбцаў і Івянца, цыганскі ансамбль «Эльпіс» з Луцка, прадстаўнікі армянскай, яўрэйскай, азербайджанскай, узбекскай культур і іншыя.

Дыяспары з Мінскай вобласці прэзентавалі традыцыйныя рамёствы і стравы нацыянальнай кухні. Пакаштаваць іх мог любы ахвотны. Ад разнастайнасці прадстаўленых народных касцюмаў, кулінарных шэдэўраў, каларытных сувеніраў разбягаліся вочы. Не паспеў паспрабаваць татарскага кыстыбая, як палякі ўжо падносілі галушкі і бігас, а грузіны прапаноўвалі хачапуры і чурчхелу. Толькі танцаваў армянскі качары, а ногі ўжо самі вялі ў запальны беларускі танец. Выйшаў з казахскай юрты, а азербайджанцы ўжо гасцінна клікалі ў сваё нацыянальнае жытло. Каб змяніць краіну, дастаткова было зрабіць некалькі крокаў.

Адным з самых цікавых у межах фестывалю быў беларускі традыцыйны стэнд. Наведвальнікі мелі магчымасць атрымаць майстар-клас па пляценні нацыянальных паясоў. Справа няпростая, асабліва для чалавека, што не прывык да карпатлівай ручной працы. Гаспадары стэнда толькі ўсміхаліся і прапаноўвалі падсілкавацца — бабкай і бутэрбродам з чорнага хлеба і сала.

Штогод фестываль нацыянальных культур у Маладзечне найлепшым чынам падкрэслівае гатоўнасць беларусаў жыць у міры і згодзе, паказвае, як важна шанаваць свае карані, любіць зямлю, з павагай і ўвагай ставіцца адзін да аднаго, да звычаяў і традыцый іншых народаў. У нашай краіне пражываюць прадстаўнікі звыш 140 нацыянальнасцей, і ўсе знаходзяць агульную мову. Мы не шукаем адрозненні, але радуемся, што можам дзяліцца сваімі традыцыямі і дзякуючы гэтаму ўзбагачаць культуру.

Традыцыйна фестываль у Маладзечне прайшоў з вялікім размахам. Тут сабраліся людзі, якія ў першую чаргу цёпла ставяцца да захавання традыцый і спрабуюць быць разам, а не спаборнічаць. Гэты факт добра ўплывае на атмасферу і ўтульнасць падчас мерапрыемства. Удзельнікі змаглі ацаніць не толькі культуру адно аднаго, але і сяброўскую павагу паміж дыяспарамі. Усе абменьваліся падарункамі і цёплымі словамі.

Вельмі важна, што такіх мерапрыестваў, як фестываль нацыянальных культур, у краіне становіцца ўсе больш. Гэта сведчыць пра неабыякавасць і імкненне захаваць самае важнае — індывідуальнасць, непаўторнасць, якія дасталіся нам ад папярэдніх пакаленняў.

Вікторыя АСКЕРА

Сустрэча са старажытнай культурай

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрыўся тыдзень кнігі Ісламскай Рэспублікі Іран

Фота Кастуся Дробава.

Раман Матульскі ўручае кнігі Мартэзу Бахрамі.

У галерэі «Лабірынт» размясцілася выстаўка разнастайных іранскіх кніг, прысвечаных гісторыі, геаграфіі, палітыцы і культуры краіны. Усе гэтыя выданні папоўнілі фонды Нацыянальнай бібліятэкі. На ўрачыстым адкрыцці тыдня прысутнічалі іранскія і беларускія госці, у тым ліку студэнты, якія вывучаюць персідскую мову. Сярод замежных гасцей — Часовы Паверaны Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь Мартэза Бахрамі.

Свята чытання ў Іране ўжо дваццаць сёмы раз арганізоўваецца ў лістападзе. Гэта час, калі праводзяцца кніжныя кірмашы і выстаўкі, конкурсы, прэзентацыі новых выданняў, адкрываюцца новыя бібліятэкі. Да Іранскага свята кнігі ў гэтым годзе спрычыніліся 12 краін, у тым ліку і Беларусь. Прадстаўнік Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Сяргей Бацян у прывітальным слове паведаміў, што культурнае супрацоўніцтва Беларусі з Іранам заснавана на Мемарандуме аб узаемаразуменні і супрацоўніцтве ў галіне культуры, навукі, адукацыі, спорту і турызму, які быў падпісаны кіраўнікамі дзяржаў яшчэ ў 1995 годзе, а таксама на Пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі, СМІ, спорту і турызму, падпісаным у 2009 годзе. Чакаецца, што ў найбліжэйшы час будзе падпісаны міжведамасны мемарандум, падрыхтаваны і распрацаваны культурнымі ведамствамі абедзвюх краін. Для многіх гэта стане вельмі захапляльным падарожжам у свет старажытнай культуры.

Саветнік па культуры Пасольства Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь Абалгасэм Махтарыян адзначыў, што мэта выстаўкі, прадстаўленай у беларускай Нацыянальнай бібліятэцы, — пазнаёміць беларускіх сяброў не толькі з кніжнай справай, але і з выяўленчым мастацтвам, з выбітнымі асобамі краіны. З гэтай нагоды кніжную экспазіцыю дапоўнілі мініяцюры мастака Агаміры і бюсты вялікіх пісьменнікаў Ірана. На імпрэзе працаваў мастак каліграфічнага пісьма Саід Сахраі, дзякуючы якому наведвальнікі маглі пазнаёміцца яшчэ з адным відам іранскага мастацтва. Абалгасэм Махтарыян выказаў спадзяванні, што ў хуткім часе Іран зможа пазнаёміць Беларусь са сваімі прыкладамі кінамастацтва.

Саветнік па культуры прадставіў цікавую статыстыку па кніжнай справе ў Іране: да перамогі Ісламскай рэвалюцыі было надрукавана каля 50 тысяч кніг, а пасля перамогі, на працягу сарака гадоў, — каля 1 230 000 выданняў. Толькі два гады таму было выдадзена сто тысяч новых найменняў. Агульны наклад мастацкай літаратуры склаў каля 20 000 экзэмпляраў. Колькасць жанчын у пісьменніцкай справе расце з году ў год. У Іране праводзіцца больш чым 20 фестываляў і іншых мерапрыемстваў, прысвечаных кнігам.

Фота Кастуся Дробава.

Фрагмент экспазіцыі.

Напрыканцы сустрэчы дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі падзякаваў замежным гасцям за выданні, якія папоўняць нашу кніжную скарбонку: «Актывізацыя адносін паміж нашымі кніжніцамі пачалася ў 2000-х, калі былі пабудаваны дзве тэхналагічна блізкія бібліятэкі — новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі Ірана. Цяпер у нашай кніжніцы больш чым тысяча выданняў, прысвечаных Ірану. Яны на розных мовах».

Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі выказаў захапленне асаблівасцямі іранскай літаратуры і паліграфіі, а пасля перадаў у падарунак спадару Мартэза Бахрамі некалькі выданняў беларускага буквара са спадзевам на тое, што беларускую мову і літаратуру будуць вывучаць і ў Іране.

Дар'я СМІРНОВА

Па слядах аднаго здымка

Мікола Нікановіч.

Год таму да 95-годдзя «Маладняка» на першай старонцы лістападаўскага нумара «ЛіМа» было надрукавана легендарнае фота з I Усебеларускага з'езда пісьменнікаў, дзе ёсць выявы амаль усіх сяброў літаратурнай суполкі. З таго часу рэдакцыя атрымала не адно паведамленне ад чытачоў: яны пазнавалі сваіх родзічаў, сваякоў, удакладнялі інфармацыю пра іх. Не так даўно прыйшоў да нас і ліст ад Яўгеніі Дзяркач з аграгарадка Кляннік Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці. Вось некаторыя вытрымкі з яго: «...Маю гэткі ж здымак, і іншыя, якія тычацца аднаго пісьменніка з ліку забытых. Гэта — Мікола Нікановіч, якому я даводжуся ўнучатай пляменніцай. На фотаздымку яго няма, магчыма, таму, што ў гэты час ён знаходзіўся на службе ў Чырвонай Арміі. Але ёсць яго сябры-маладнякоўцы».

Пра жыццё пісьменніка, дзе былі і перамогі, і паразы, і хвіліны акрыленасці, і моманты роспачы і тугі, можна было б напісаць раман. Пра тое, якім ён запомніўся, расказала Яўгенія Дзяркач. Яна вельмі шануе памяць пра таленавітага родзіча. У сталым веку жанчына пераехала з горада ў вёску, дзе напрыканцы XIX стагоддзя было «фамільнае гняздо» яе продкаў па матчынай лініі — Уладзіміра і Юліі Нікановічаў.

Мікола, будучы пісьменнік, нарадзіўся 2 красавіка 1902 года і быў трэцім дзіцём у сям'і. У сялянскай сям'і, паводле інфармацыі з пісьменніцкіх даведнікаў. Але гэтыя звесткі памылковыя. Яўгенія Дзяркач, зацікавіўшыся лёсам Міколы Нікановіча і ўласнай радаслоўнай, працавала ў архівах, каб адшукаць звесткі пра сям'ю. Яна знайшла дакументы, дзе значыцца, што Уладзімір Нікановіч быў адстаўным фельдфебелем царскай арміі, а ў Кляннік пераехаў загадваць віннай лаўкай. З ім пераехала і жонка Юлія, у дзявоцтве Астрэйка. Паходзіла яна з мяшчанскага асяродка, мела гімназічную адукацыю. Былі ў яе родзе і пісьменнікі. Відаць, Міколу пісьменніцкі дар перадаўся менавіта ад маці. Адзін з братоў Юліі, дарэчы, быў артыстам драматычнага тэатра.

Калі Міколу было 8 гадоў, бацька загінуў. Апякунства над малым узяў муж старэйшай сястры Вольгі Сцяпан Пашкевіч. Даў яму пачатковую адукацыю, потым уладкаваў ва Ігуменскую гімназію, пасля сканчэння якой Мікола стаў працаваць у Кляннику настаўнікам. Тады ж і праявіўся пісьменніцкі талент: пачаў пісаць вершы, нарысы, апавяданні, дасылаў у рэдакцыі. Першая публікацыя была ў «Савецкай Беларусі» ў 1923 годзе. Уступіў у «Маладняк» (што стала сюжэтам аднаго з апавяданняў). Гэтыя часы былі найбольш плённыя і натхнёныя ў жыцці Міколы Нікановіча. Разам з сябрамі-пісьменнікамі, сярод якіх быў маладняковец Васіль Каваль і іншыя, ён прыязджаў у родную вёску. Асабліва любілі слухаць расповеды Міколавага дзеда Міхалкі, які застаў прыгоннае права. На матэрыяле тых расповедаў потым пісалі творы. Так выйшла кніга «Пад прыгонам», асобнік якой і падарылі дзеду Міхалку...

Асабістае жыццё Міколы было пакручастае: кахаў мясцовую дзяўчыну Анэлю, яна ж была закаханая ў іншага. Але замуж выйшла за Нікановіча, перайшла да яго жыць. Нарадзіліся дзве дачкі: Вольга і Маргарыта. Міколу ж запрасілі на працу ў Мінск, у рэдакцыю «Чырвонай змены». Уладкаваўшыся, атрымаў кватэру, хацеў забраць у сталіцу і сям'ю. Жонка не паехала, засталася з дзецьмі ў вёсцы. Разышлася з Міколам і выйшла замуж за таго, каго даўно кахала. Мікола ж ажаніўся другі раз у Мінску: Вольга была супрацоўніцай той жа рэдакцыі... Нарадзіўся сын Валодзя. Здавалася б, вось яно, шчасце: улюбёная праца, узаемнае каханне, жаданае цяпло сямейнага ачага, дзе любяць і чакаюць, незалежна ад таго, якія поспехі ў цябе на службе...

У 1933 годзе ў адным з нумароў «Чырвонай Змены» быў надрукаваны артыкул, дзе крытыкавалася палітыка Сталіна. З гэтай нагоды ўсе супрацоўнікі выдання былі арыштаваныя і прызнаныя ворагамі народа. Падчас следства іх трымалі ў турме на Валадарскага. Адразу ж на рэдакцыю наклалі арышт і ўвесь наклад, што быў у друку альбо планаваўся ў друк, знішчылі. Кнігі, якія ўжо былі выдадзены, сабралі па бібліятэках і знішчылі таксама. А іх было нямала: зборнікі апавяданняў «Золак» (1926), «Радасць» (1926), «Крык працы» (1928), «Вясновы прамень» (1929), аповесці «Мяцеліца» (1930) і «У паўстанцаў» (1931)... Прысуд быў такі: Міколу выслалі ў Растоў-на-Доне, а жонку з дзіцём выселілі з кватэры і забаранілі пражываць у Беларусі (яна з'ехала на Украіну, адкуль паходзіла). У Растове Мікола працаваў карэспандэнтам газеты, а як пачалася вайна, пайшоў на фронт...

Пасля сваякі атрымалі даведку, што ў кастрычніку 1944 года Мікола Нікановіч прапаў без вестак на тэрыторыі Чэхаславакіі. Былі спробы адшукаць яго сляды: сваякі пасылалі запыты ў росшук, але там толькі пацвярджалі ранейшую інфармацыю. Рэабілітавалі пісьменніка ў 1956 г. Жонка звярнулася ў творчую арганізацыю — там сабралі ўсе матэрыялы, якія па ім засталіся, і выдалі кнігі «Летнім днём» (1960) і «Светлая даль» (1985) (апошняя — з уступным артыкулам Міхася Мушынскага).

Рукапісы пісьменніка захоўваліся ў вёсцы. Маці берагла іх, хавала ў куфры, заклаўшы розным начыннем (спачатку — каб не знайшлі следчыя з органаў, пасля — падчас вайны). Але ў вайну не было чаго есці... Юлію звалі да сябе сваякі з іншай вёскі — усё ж гуртам лягчэй ператрываць любыя нягоды. Яна адмовілася ад пераезду: вартавала спадчыну сына... Не здолела: памерла ад голаду... У хаце, дзе яна жыла, пасля вайны зрабілі амбулаторыю. Там не было чым паліць печку: так і згарэлі знойдзеныя ў куфры паперы… Пляменніца пісьменніка ў 1953 годзе, наведаўшы амбулаторыю, заўважыла на падлозе некалькі спісаных аркушаў, падняла іх і гаворыць санітарцы: «Гэта ж рукапісы дзядзькі Міколы! Што ж ты робіш?» Тая адказала, што больш нічога не засталося, усё спалілі…

Яўгенія адшукала Уладзіміра Нікановіча, сына пісьменніка ад другога шлюбу (ён жыў у Растоўскай вобласці), размаўляла з ім па тэлефоне. Сустрэцца не паспелі: Уладзімір памёр. Вядома пра яго тое, што жыў адзінокім.

Матэрыял падрыхтавала Яна БУДОВІЧ

Фота — з прыватнага архіва Яўгеніі Дзяркач

Рэдактарскі калектыў «Чырвонай змены» падчас сустрэчы з Уладзіславам Галубком (сядзіць першы злева). Мікола Нікановіч стаіць першы справа. 1929 г.

ЗЕРНЕ СЛОЎ

З Яўгеніяй Янішчыц. Іван Бурсаў — кіраўнік семінара на V Усесаюзнай нарадзе маладых пісьменнікаў.

Пакінуў нас Іван Бурсаў — паэт, празаік, перакладчык, журналіст. У яго творчай спадчыне — кнігі прозы, 14 зборнікаў вершаў, мноства кніжак для дзяцей. Творы Івана Цярэнцьевіча перакладзены на балгарскую, нямецкую, польскую, украінскую мовы, а найперш — беларускую.

Нарадзіўся будучы пісьменнік 19 снежня 1927 года ў Клімавічах Магілёўскай вобласці. Працоўны шлях пачынаў на Чалябінскім металургічным заводзе, на Мінскім трактарным…

Першыя вершы чытаў сябрам літаб'яднання пры газеце «Знамя юности». Пасля заканчэння Літінстытута ў Маскве працаваў рэдактарам часопіса «Нёман» (1962—1964). Пазней стаў супрацоўнікам маскоўскага часопіса «Молодая гвардия».

У 2011 годзе Іван Бурсаў выдаў прэзентатыўную анталогію беларускай паэзіі «Шаги». У выданні сабраны творы «пачынальнікаў», «нашаніўцаў», «маладнякоўцаў» і «ўзвышэнцаў» — усяго сорак сем творцаў з вялікай грамады літаратурнага шэсця. Асобны раздзел анталогіі напоўнены перакладамі спадчыны Алеся Смаленеца (А. Ружанцова), Ларысы Геніюш, Аляксея Пысіна. Зборнік заканчваецца ўдумным артыкулам «Мой Янка Купала» і вершам-прысвячэннем з нагоды ўсталявання ў Маскве помніка класіку беларускай літаратуры.

А ў 2016 годзе Іван Цярэшкавіч (як называў свайго сябра Рыгор Барадулін) выдаў новы зборнік пад назвай «Дыхание времени», дзе змешчаны яго пераклады на рускую мову вершаў многіх беларускіх паэтаў. Удзячны добразычліваму маскоўскаму творцу і я. У сціплую падзяку нястомнаму магіляўчаніну паспрабаваў «вярнуць» на мову радзімы Бурсава некалькі яго лірычных вершаў.

Сяргей ПАНІЗНІК

Іван БУРСАЎ

Зерне слоў

Шурпаты шум палёў,
птушыны гмах нябёс —
усё, што пакахаў,
і ў сэрцы прыбярог, —
узняў на думны лёс,
над плёсамі разнёс,
каб зерне
спелых слоў
сабраць у звонкі рог.
Каханне не замрэ…
І пойдзе новы рост
ад збажыны, з якой
я ўсплыў
па-над зямлёй…
Вам любасці сцябло!
Будзь плоднаю, любоў,
над вашаю вясной,
над… памяццю маёй!

Лабжанка

Крылатым соснам
лета як служанка —
яны звіняць,
каб знікла і слата…
А рэчка
называецца Лабжанка,
і ў рэчцы той
зялёная вада.
Яна хвалюецца
на асачынах,
дае хвастам яршовым круцяля.
Тут не вада —
жывы нектар айчыны,
дзе сам я прытуляўся да камля.
Крылатым соснам
Лета як служанка —
прымкнулася дзяцінства
дабрата…
Я ў горкі час
уміг з табой, Лабжанка!
У прысмаку
зялёная
вада.

Зазімак

Слязу
скаціла кропля за акном.
А на двары ані зімы,
ні лета.
І лес,
разнюханы бялюткім сном,
страсае снег з махровых
эпалетаў.
Ля ног яго
сумёты
з-пад палы
выглядваюць, бо ім ужо
не спіцца,
камлі і кроны ў водары смалы,
капежыцца вясёлая ігліца.
Прачнуўшыся між летам і зімой,
з пагодай лес нядужы
разабрацца.
Стаіўся, як і я перад табой,
не ведаючы —
плакаць
ці ўсміхацца.

Пераклаў з рускай мовы Сяргей ПАНІЗНІК

«Дамы і зямля, навекі нашы…»

Якія б героі не дзейнічалі у гістарычным рамане, рэальныя ці выдуманыя, ці не галоўнае, каб чытачу не было сумна на працягу твора?

Паглыбіцца ў XIII стагоддзе запрашае чатача гістарычны раман Алеся Аляшкевіча «Замкавая гара» (Мінск, «Выдавецкі дом "Звязда"», 2019). Па форме твор традыцыйны: аўтар стварае сукупнасць выразных карцін з жыцця тагачаснага Полацкага, Новагародскага, Пінскага, Берасцейскага княстваў, Літоўскага каралеўства, якія вялі жорсткую барацьбу з крыжакамі і мангола-татарамі.

Галоўнай мэтай апавядальніка бачыцца стварэнне вобразаў мужных сыноў-абаронцаў сваёй зямлі: князёў Войшалка, Таўцівіла, Шварна, Аляксандра Неўскага, Давыда Гарадзенскага, першага караля Вялікага Княства Літоўскага Міндоўга. Алесь Аляшкевіч імкнецца паказаць не постаці, звесткі аб якіх амаль зніклі ў плыні стагоддзяў, а людзей з іх мроямі, шчырымі пачуццямі і перажываннямі, з іх узнёслым каханнем. Гэткай жа ўзнёсласцю прасякнуты ўвесь раман, таму нават не здзіўляе высокая канцэнтрацыя слова-злучэнняў накшталт «свяшчэнны горад», «каварны вораг» і «храбрыя воі» ўжо на першых старонках.

Няма сэнсу пераказваць змест твора, бо ў яго аснове — падзеі мінулага, няхай і прыхарошаныя фантазіяй аўтара. Раман, дарэчы, патрабуе ў належнай ступені і асаблівай увагі, і канкрэтных ведаў, бо ў ім хапае даволі спрэчных меркаванняў і дапушчэнняў. Аўтар разгледзеў час ад знішчэння горада Арконы, цэнтра балтыйскага славянскага племені рутэнаў, да пераезду вялікага князя Гедыміна ў Вільню, калі «Вялікае Княства Літоўскае распраўляла свае крылы». Міжусобныя войны, здрады, памкненні да аб'яднання зямель — усё гэта лагічныя складнікі сюжэта гістарычнага рамана (у дадзеным выпадку цалкам хранікальнага). Не дзіва, што асаблівае месца тут нададзена постаці Міндоўга. Ствараючы, па сутнасці, новую дзяржаву, герой прамаўляе: «…Усё жыццё нам і нашым нашчадкам тут цяпер стаяць! І бараніцца ад ворагаў! І трэба будаваць і рабіць усё так, каб ніхто не здолеў адняць ад нашых веж ніводнага бервяна! Дамы і зямля гэтыя цяпер нашы навекі. Навекі і будавацца будзем!»

Захапіўшыся апісаннем шматлікіх здзяйсненняў і атмасферы ваяўнічасці і гераізму ўвогуле, аўтар час ад часу забываецца, што празмерная насычанасць падзеямі і героямі не на карысць твору, бо нагадвае ў большай ступені падручнік па гісторыі, чым мастацкі твор. Але адзін з тых пунктаў, што супярэчаць «дакументальнасці», — ідэалізацыя аўтарам амаль усіх герояў: ад воінаў да іх абранніц. Існуе велізарны лагер станоўчых персанажаў ды невялікі і амаль што безыменны лагер персанажаў адмоўных: ворагаў-заваёўнікаў і здраднікаў. Якраз у гэтым бачыцца ўраўноўванне свядомасці большасці асоб, якія пасля прачытання зліваюцца ў адзін вобраз героя і пераможцы, што клапоціцца пра сваю зямлю і будучыню народа. Таму трэба сказаць, што сваёй мэты аўтар дасягнуў.

А вось прывабіць чытача, які не надта цікавіцца перыпетыямі беларускага мінулага, у Алеся Аляшкевіча можа і не атрымацца, бо раман падаецца даволі статычным і няма выразнай ні

любоўнай, ні дэтэктыўнай лініі. Дарэчы, у гэтай сувязі магла б атрымацца спроба стварыць альтэрнатыўную гісторыю, калі героі і падзеі паўсталі б перад намі нязвыклымі і нават супярэчлівымі. У гэтым выпадку ў іх было б больш шансаў стаць цікавымі не сваёй знакавасцю, а як адмысловыя персанажы мастацкага твора. У кнізе гэта выглядае як паўмера: нараўне з жыццём вядомых нам герояў вырашаюцца і лёсы братоў Сулічаў. Але ім нададзена не так і шмат увагі.

Відавочна, аўтар, нягледзячы на жаданне крыху памарыць, імкнецца да рэалістычнай традыцыі, стварэння зразумелага выразнага летапісу, які павінен ведаць кожны. Таму пытанне культурна-гістарычнага кантэксту для Алеся Аляшкевіча стала прынцыпова важным. Пісьменнік праз асабістую «падкаванасць» дамагаецца і такіх жа выдатных ведаў ад чытача: а гэта не толькі звесткі пра барацьбу за ўладу, незлічоныя войны і будаўніцтва гарадоў. Гэта падрабязны аповед з апісаннем ледзь не ўсіх прычынна-выніковых сувязяў, якія даюць падставу і самому чытачу разважаць, што было сапраўды неабходна і чаго лепей было б пазбегнуць. Тут і пагадненне паміж Літвой, Полацкам і Уладзімірам аб сумеснай барацьбе з лівонскімі крыжакамі, і помста за Міндоўга, і княжанне Віценя і многія іншыя падзеі.

Кніга спадабаецца аматарам дасканалага вывучэння айчыннай гісторыі. Раман «Замкавая гара» — гэта сапраўды той дапаможнік, які можа сарыентаваць у акалічнасцях таго часу. А ў цэлым у творы бачыцца выдатны падмурак для стварэння гістарычнага серыяла.

Яўгенія ШЫЦЬКА

ГЛЕДЗЯЧЫ Ў ВОЧЫ ПРАЎДЫ І СЯБРОЎ

Магчыма, чортаў тузін, якога некаторыя так баяцца, не такі ўжо і страшны. Бо надараюцца і выпадкі адваротнага кшталту: калі сустрэча з ім прыносіць радасць. Пераканаўся ў гэтым дзякуючы кнізе Міколы Чарняўскага «На парозе дабрыні і болю», якая сёлета пабачыла свет у выдавецтве «Народная асвета». Нецярплівы чытач, канечне, гатовы здзівіцца. Маўляў, прычым гэты самы тузін, калі назва ў яе зусім іншая? Ды сувязь самая непасрэдная. Пад адной вокладкай сабраны літаратурныя партрэты трынаццаці беларускіх пісьменнікаў. Здавалася б, «суседства» — не з лепшых, паколькі прысутнічае «нешчаслівая» лічба 13. Але распавядаецца так, што на яе не звяртаеш увагі.

Слынны майстар слова М. Чарняўскі, аўтар не аднаго дзясятка кніг для дзяцей, зборнікаў паэзіі, прозы, піша так, што душа радуецца, а сэрца атуляецца цеплынёй, ад якой хочацца глядзець на свет больш адкрыта і даверліва. Усё, пра што ён прамаўляе, напоўнена глыбокім мастацкім роздумам. Прысутнічае і не менш важнае: лёс кожнага, пра каго расказваецца, успрымаецца і як частка лёсу аўтара, бо ў іх былі і асабістыя стасункі.

Кажуць, што любіць ўсё чалавецтва куды прасцей, чым аднаго канкрэтнага чалавека. То-бок, лягчэй і прасцей захапляцца дасягненнямі ўсёй літаратуры і куды цяжэй прынцыпова ацаніць набыткі пэўнага пісьменніка. Асабліва калі ён успрымаецца ў нечым тваім літаратурным сапернікам: можа даць знаць пра сябе звычайная творчая зайздрасць. Толькі падобнае стаўленне не для М. Чарняўскага — ён застаецца аб'ектыўным і добразычлівым, а лепшым творам іншых пісьменнікаў шчыра радуецца. У чым і пераконвае кніга «На парозе дабрыні і болю».

Падставай для напісання яе, як відаць з верша «Пара настала запытаць, як жыў…», стала жаданне зрабіць пэўнае падрахункаванне набыткаў пражытых гадоў праз лёсы тых, з кім перасякаўся твой:

Пара настала запытаць, як жыў:
Ці кожным днём пражытым даражыў,
Ці ўсё, што зроблена, —
Засевак твой, —
Багаты, плённы, радуе сяўбой?
Ці ўсім знаёмым дзверы адчыніў,
Ці ўсё па справядлівасці чыніў,
Ці ўсмешку на насмешку не змяніў?

Пра каго М. Чарняўскі б ні расказваў, ён толькі зрэдку выкарыстоўвае вядомыя факты з біяграфіі гэтага пісьменніка. Наадварот, абавязкова прыводзіць такія звесткі, якія вызначаюцца навізной, дазваляюць лепш убачыць і глыбей спасцігнуць таго, каго ўзяў у якасці «героя» свайго аповеду. Пры гэтым не абмяжоўваецца разглядам пэўных момантаў творчасці: шмат якія развагі пабудаваны на ўспамінах, што, несумненна, дазваляе той ці іншы партрэт падаць больш аб'ёмна, шматгранна. У народзе кажуць сустракаюць па апратцы, а…

Датычна да творчасці можна сказаць, што свайго роду «апратка» яе — гэта назва таго ці іншага твора. Ці то памятаючы пра гэта, а можа, і інтуітыўна М. Чарняўскі знайшоў арыгінальны падыход. Пачатак кожнай публікацыі (выключэнне — гаворка пра Х. Чэрню) пазначаны радком, узятым у таго, з кім чакаецца знаёмства. Пасля ўжо ў дужках удакладняецца «З жыцця…». Для прыкладу гэта выглядае так: «Палескі блытанік і чараўнікі таямнічага вострава Кнігі» (З жыцця Артура Вольскага і Янкі Маўра). Дарэчы, гэта адзіны выпадак, калі ў адным артыкуле-ўспаміне аб'яднаны дзве постаці). Наступны матэрыял — «Спявалі песню мне вятры…» (з жыцця Уладзіміра Дубоўкі).

Пра кожнага з гэтай тройцы можна даведацца такое, чаго ў публікацыях іншых аўтараў не напаткаеш. Такім шляхам аўтар кнігі ідзе і ў далейшым: «І я цяпло для ўсіх дарыў…», «Не трэба жыць як набяжыць…», «Жыў на свеце дзед Васіль…», «Каб быць бліжэй да Бугала…», «Палесся мілае дзіця…». Абліччы Станіслава Шушкевіча, Анатоля Грачанікава, Васіля Віткі, Рыгора Барадуліна, Яўгеніі Янішчыц набываюць рэальнасць, паўстаючы быццам жывымі. М. Чарняўскі згадвае іх з той цеплынёй, якая магчыма толькі тады, калі чалавека добра ведаў. Ды не менш добра знаёмы з яго творчасцю. Асабістае пры жаданні і ўменні лёгка ўвязаць з тым, што мае і грамадскае значэнне, бо творчасць згаданых паэтаў — тая старонка, што назаўсёды прапісалася ў гісторыі нацыянальнай літаратуры.

Хораша расказвае М. Чарняўскі і пра Анатоля Сербантовіча, Хведара Чэрню, Маргарыту Яфімаву, чыя творчасць сённяшняму чытачу, магчыма, вядома менш, хоць заслугоўвае ўвагі, бо яны таксама былі людзьмі таленавітымі. А. Сербантовіч і Х. Чэрня — у паэзіі, а М. Яфімава — у крытыцы і літаратуразнаўстве.

Несумненна, сапраўдным адкрыццём для многіх стане творчасць Міхася Даніленкі («Пагрукала восень кіем у акно…»). Найцікавейшы празаік, які, як і многія, пачынаў з вершаў, чалавек трагічнага лёсу, ён з гадамі не растраціў душэўнай шчодрасці, цеплыні. Пасля сябе пакінуў нямала твораў, якія, думаецца, крытыкай яшчэ належным чынам не ацэнены.

Лёс, які так жорстка выпрабоўваў яго, нарэшце зліталваўся. Міхась Пятровіч пайшоў у вечнасць 24 лютага 2019 года на дзевяноста сёмым годзе. Бадай, Усявышні так шмат і адвёў яму, што сваім прыкладам М. Даніленка даказаў: чалавек можа заставацца чалавекам, нягледзячы на тое, праз якія нягоды праходзіць. Пісьменнікам — таксама. М. Даніленка не толькі сам плённа працаваў у літаратуры. Ахвотна падтрымліваў тых, хто рабіў у журналістыцы, літаратуры толькі першыя крокі.

У гэтым яшчэ студэнтам упэўніўся і я, паслаўшы ў газету «Гомельская праўда» рэцэнзію на кнігу кагосьці (каго, на жаль, запамятаваў) з ураджэнцаў Гомельшчыны. Як жа ўзрадаваўся, калі яна была неўзабаве надрукавана пад рубрыкай «Кнігі нашых землякоў». Адбылося гэта дзякуючы Міхасю Пятровічу, які працаваў у рэдакцыі «Гомельскай праўды». Друкаваўся я ў ёй і пазней: працуючы ў раённых газетах, служачы афіцэрам у далёкім Забайкаллі. Асабіста мы пазнаёміліся толькі тады, калі Хведар Жычка ўжо запрасіў мяне на працу ў «ЛіМ».

У згадках М. Чарняўскага прысутнічае шмат асабістага, што спрыяе асаблівому даверу ва ўспрыманні пададзенага. Зацікаўленасць выклікаюць і інтрыгоўныя падзагалоўкі: «У гасцях у Ісакоўскага і …», «Едуць маразы з белымі бародамі…», «Закаханы ў Карэлію і заняволены «Свабодай». А перадусім — высокая ацэнка творчасці таго, хто, безумоўна, з'яўляецца адным з самых таленавітых сучасных паэтаў.

Калі перагортваеш апошнюю старонку літаратурных партрэтаў, напісаных М. Чарняўскім, глыбокі сэнс набывае заключная страфа верша «Пара настала запытаць, як жыў…»:

[…] у кнізе я (хацеў ці не хацеў),
А ў вочы праўды і сяброў глядзеў.
Імкнуўся з імі
Іх жыццё пражыць…
Іх добрых дзей перасягнуўшы поле,
Прысядзь, чытач, са мною на мяжы,
Як на парозе дабрыні і болю…

Позірк у вочы праўды і сяброў атрымаўся шчыры і праўдзівы. Кніга «На парозе дабрыні і болю» годна працягвае тыя выданні адпаведнага кшталту, што былі напісаны старэйшынамі беларускай літаратуры Сяргеем Грахоўскім, Паўлам Прудзікавым, Янам Скрыганом, Міколам Хведаровічам, Іванам Шамякіным, Станіславам Шушкевічам і іншымі пісьменнікамі, якія, расказваючы пра час і пра сябе, прыадкрылі шмат якія цікавыя старонкі, што дазваляюць прасачыць жыццёвыя і творчыя перыпетыі, да якіх спрычыніліся і самі яны, і тыя, хто жыў і ішоў з імі поруч.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Блуканне ў тумане

Удваццаць першым стагоддзі ва ўсяго — нават у вершаў — ёсць паняцце камерцыйнага поспеху. Некаторыя кнігі маюць прыгожую інстаграмную вокладку і атмасферны тэкст, які прыемна чытаць у халодны восеньскі вечар, захінуўшыся ў плед (часам іх, дарэчы, так і анансуюць). Іншыя ж тэксты абрынаюцца на цябе плынню аўтарскай харызмы, аўтарскага светапогляду, замыкаючы над галавой купал створанага словамі свету. Нельга сказаць, што «ўсе кнігі падзяляюцца на два тыпы» і апісаным абмяжоўваецца ўвесь вялізны пласт сучаснай літаратуры. Гэтае невялікае супрацьпастаўленне выключна сітуатыўнае — і ўведзена ў тэкст для таго, каб сказаць, што паэтычны зборнік Цемрыка Велета «Злом» («Галіяфы», 2019) знаходзіцца дзесьці паміж абазначанымі пунктамі.

Кніга афармлена мінімалістычна і выглядае густоўна. Адкрываючы яе, сустракаеш знаёмую воку карціну: акуратныя верлібрычныя слупкі, радкі рознай даўжыні, адвольнае падзяленне на строфы, адсутнасць загалоўных літар. Пачынаеш чытаць, і перад вачыма фонава праплываюць асацыяцыі: амерыканская паэтычная традыцыя мінулага стагоддзя, тэксты песень постпанкавых гуртоў, плынь свядомасці, спавядальнасць. Пры агульным падабенстве матываў не адчуваецца другаснасці, не становіцца сумна, хаця прачытаць усе восемдзесят паэтычных старонак нагбом цяжкавата. Гэта той тэкст, які варта ўспрымаць паступова, ён патрабуе часу на засваенне.

шчасця няма.
альбо гэта падзенне каменя ў студню.
сярод грымотаў метро падзенне скарыстанага квітка.
шчасця няма.
ёсць толькі пробліск сонца вечаровага між дрэваў
і незразумелы повеў ветру з ракі.
шалёны рух пяску на нёманскім беразе,
знікненне формы, пачуцця —
аголенае цела ў квецені.
шчасця няма.

Хочацца называць усе творы кнігі адным тэкстам, бо яны ствараюць своеасаблівую мазаічную карціну. Кожная страфа і кожны вобраз успрымаюцца як цэласнае выказванне, часам гэта падмацоўваецца яшчэ і афарыстычнасцю фразы. Магчыма, за кошт менавіта гэтага цэласнасць кожнага асобнага верша быццам размываецца, творы перацякаюць адзін у іншы праз вобразныя структуры, якія маюць агульную тэматычную накіраванасць і эстэтыку. Прыёмы і вобразы насамрэч цікавыя, таму засумаваць пры чытанні не давядзецца, але стаміцца можна. Па пералічаных асацыяцыях зразумела, што матывы ў тэксце змрочныя, часам выкарыстоўваецца эстэтыка пачварнага, рамантыка шчымлівай безвыходнасці. Велет выкарыстоўвае метафары, выбудаваныя праз цялеснасць, уводзіць у кантэкст элементы бытавых замалёвак, але, што варта заўважыць на карысць аўтара, абыходзіцца без цыгарэт і падаконняў, прыгожа абмінае клішэ, характэрныя для такой эстэтыкі.

Амаль ва ўсіх вершах маўленне вядзецца ад першай асобы: паэтычны суб'ект — або наратар, апавядальнік, або назіральнік. Наладжваць сувязь паэтычнага суб'екта з аўтарам — справа бессэнсоўная, бо ў дадзеным выпадку цэласная карціна, якую ўтвараюць усе творы кнігі, вызначае такую ж цэласнасць паэтычнага суб'екта. Часам апавядальнік звяртаецца да кагосьці, пачынае маўленне ад другой асобы, але амаль ніякіх прыкмет гэтай «другой асобы» не прыводзіцца. У некаторых вершах асобу, да якой звяртаецца апавядальнік, можна ўмоўна вызначыць як каханую дзяўчыну лірычнага героя, часам яна — адзіная светлая пляма ў тэксце, здольная прысутнасцю ў дзвюх радках перакуліць агульны настрой, але і там яна паўстае больш суразмоўцам, чым аб'ектам выяўлення пачуццяў. Увогуле, надаць пэўную катэгарычную характарыстыку — «пра каханне» або «элегічныя», або «філасофскія» — вершам Велета складана.

не баяліся мы новых ведаў, і ты распавядала
пра ўсё, што даведаўся за дзень, і я распавядаў пра ўсё,
што зведала за хвілю, топкую, бы твань.
а потым мы разам хадзілі ў места
і на рунічна-салярных скрыжаваннях вулкаў
маліліся прызначаным настаўнікамі багам.
ты вучыў мяне стагнаць, як мужчына,
я вучыла цябе плакаць, як жанчына,
і настаўнікі былі дужа задаволеныя нашымі поспехамі.

Асаблівае месца ў прастора-часавай структуры «Злома» займае дзяцінства. Згадкі пра яго ўзнікаюць часта, яно лагічна абазначаецца пунктам адліку, але, улічваючы настрой вершаў, пачаткам бессэнсоўнага існавання. У адным з вершаў аўтар выказвае моцную агіду да дзяцінства. У іншых тэкстах такое стаўленне змяняецца на больш спакойныя, больш фрагментарныя асацыяцыі.

бо кожны быў калісьці той брыдотаю,
якою вызначаюцца так дзеці,
і так мне хочацца чамусьці верыць,
што проста свет наш — гэта сон:
дзіцятка спіць, ссе пальчык, сніць нас.
з днём боўтання ў крыві мяне,
з днём нараджэння.

Стаўленне да існавання аўтар-або-паэтычны-суб'ект пераносіць на стаўленне да творчасці. Тут ізноў узнікаюць метафары дзяцінства і нараджэння. Афарыстычныя радкі, якія вызначаюць гэтую пазіцыю, усё адно даволі абстрактныя і прымушаюць чытача блукаць у сэнсах, загорнутых густым туманам метафар. Напрыклад:

напісанае слова да дзіцяці памерлага падобнае
да немаўляці, што ў скрыначку паклалі і назвалі труной,
таму я забіваю ледзь не штохвіліны.
Ці:
калі б смерць была моваю,
што далася б з матчыным малаком,
я тады б не хадзіў па гразкай вясновай зямлі
і не пытаў
у спічастых вершалін,
і не ўслухоўваўся б, як птушкі перагортваюць старонкі
неба крыламі.
але не.
і таму
вясна — тужлівая часіна.

Здаецца, вершы «Злома» можна даволі выразна ахарактарызаваць адсутнасцю пэўнага выказвання. Але гэта зусім не абазначае адсутнасць сэнсу і мэты напісання. Калі вярнуцца да пачатку гэтага тэксту, «Злом» — сапраўды даволі настраёвае чытво, але яно не лёгкае і не захапляльнае. Яно падобнае да блукання ў тумане, у якім кожны ідзе за аўтарам, а прыходзіць туды, куды ў каго атрымаецца. Нічога не тлумачыць і нічога не даказваць — хіба не добрая якасць для паэзіі?

Дар'я СМІРНОВА

ПРЫСУТНАСЦЬ ПАЭТА

Быць крытыкам — гэта таксама мастацтва. Мастацтва, якое патрабуе не толькі паклікання і прыроджанай далікатнасці. Часам самаабвешчаны крытык так захапляецца, што забывае: у яго руцэ пяро, а не адбойны малаток! Зборнік крытычных эсэ Дзмітрыя Радзівончыка «Насустрач спадарожнаму ветру» — якраз поўная, і прыемная, супрацьлегласць такой з'яве. Філолаг па прафесіі, аўтар па-майстэрску пільна, але разам з тым беражліва даследуе творчасць 18 сучасных айчынных паэтаў. Вельмі розных. Дык чаму ж яны сабраны пад адной вокладкай?

Зроблена гэта было, відавочна, з заяўленай аўтарам высакароднай мэтай — фарміравання сапраўднай культуры: «…Толькі гарманічнае спалучэнне творчасці і прыкладной навукі пра яго здольна пераадолець многія выклікі часу, а ў выніку будзе сапраўдная культура — культура самавыяўлення і культура ўспрымання мастацтва». Менавіта пра

гэта мы штодня чуем з экранаў тэлевізараў, чытаем на старонках газет. Культура, унутраная і агульная, — што можа быць больш важна для разумнага чалавека, прагрэсіўнага грамадства?..

Наталля Батракова, Валерый Грышкавец, Пётр Сямінскі, Мікалай Намеснікаў, Лізавета Палеес, Міхаіл Кулеш і многія іншыя — аўтар выбраў у якасці прадмета свайго крытычнага аналізу творчасць паэтаў і паэтэс з розных рэгіёнаў Беларусі, не замыкаючыся толькі на знаёмай яму Гродзеншчыне.

Аднак спіс з 18 паэтаў тут усё ж не зусім правільны. Таму што з першай і да апошняй старонкі ў кнізе прысутнічае і дзевятнаццаты паэт. Гэта сам Дзмітрый Радзівончык, аўтар трох паэтычных зборнікаў. Як філолагу-літаратуразнаўцу, а таксама як калегу яму ёсць чым захапіцца, што адзначыць, з чым не пагадзіцца, што параіць аўтару. Дзмітрый раскрывае творчасць кожнага аўтара вельмі яскрава, вобразна. Свабодалюбная жанравая форма эсэ запрашае чытача на тэрыторыю літаратурнай майстэрні з іншасказанняў, алюзій, даволі вострых, глыбокіх філасофска-сацыяльных абагульненняў і палемічных разваг.

Цытуючы строфы, Дзмітрый Радзівончык трапна выбірае такія радкі, якія ствараюць літаратурны партрэт кожнага аўтара, адлюстроўваюць яго патэнцыял у цэлым. Зрэшты, няўдалыя радкі цытуюцца ім з не меншай шчырасцю, але характарызуюцца вельмі далікатна. Аўтар даследуе матэрыял, выкарыстоўваючы такія навуковыя паняцці, як «аксюмарон», «аказіяналізм», «метанімія», «сінекдаха» і пад. Але справядліва мяркуючы, што не ўсякі чытач таксама філолаг, Дзмітрый Радзівончык усё ж клапатліва тлумачыць у дужках значэнне тэрміну.

Тым не менш, ёсць у зборніку эсэ і спрэчныя моманты, якія выклікаюць здзіўленне. Гэта не раз згаданая аўтарам так званая «жаночая паэзія» і нават больш за тое — філасофія. Усё ж у сапраўдных паэзіі і філасофіі няма полу. Лічу, што не варта паддавацца спакусе стэрэатыпнага ўспрымання, калі рыфмы ў славу няшчаснага кахання і перабольшаная «туга па моцным плячы» адразу ж маркіруюць паэзію па гендарным прынцыпе. Калі ж Дзмітрый Радзівончык працягне развіваць дадзеную думку ў крытычным аналізе, ён рызыкуе аднойчы ўбачыць свае кнігі спаленымі на аўтадафе сучасных феміністак, даўшы падставу для сярэднявечных перформансаў.

Арыгінальная эсэістычная манера не толькі робіць мову кнігі жывой і цікавай, але і ўскосна раскрывае асобу і самога аўтара кнігі. Добрае, займальнае эсэ — гэта заўсёды крыху і аўтапартрэт, і аўтабіяграфія. Часам чыста з мужчынскай увагай аўтар захапляецца і вобразна параўноўвае адну з паэтэс то з рудавалосай драматычнай Ліліт, то з бялявай трагічнай Ларэлеяй. Эрудыцыя, адукаванасць, мастацкі густ аўтара гавораць самі за сябе, пераборліва адсылаючы чытача то да антычнасці, то да актуальных праблем сучаснасці, то ўжо да вобласці футуралогіі, шчодра аздабляючы змест зборніка эсэ «Насустрач спадарожнаму ветру» метафарамі, намёкамі, жартамі і нават анекдотамі.

Такім чынам, кніга Дзмітрыя Радзівончыка можа зацікавіць не толькі прафесійнага літаратуразнаўцу, літаратара, але будзе зразумелая і шырокай чытацкай аўдыторыі.

Таццяна ЛАШУК

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ

Замкавы час Беларусі

(урывак з летапіснай паэмы)

...Ранне ў сонечных накрапах —
той і век усё, і дзень,
ды ўзлятае Мірскі замак
у прасторах тых жа самых,
хоць здаецца, што расце…
Вось маршалак — існа мірскі,
на карыслівасць не кідкі,
так, Ільініч Ежы, — ён.
З імем «Юрый» — больш нам блізкі, —
застанецца ўжо спакон.
Станіслаў ды меншы Юрый
стрэнуць замкам жыццяў буры
і набудуць графства нат,
і яно ўжо Мірскім стане,
Радзівілам, не, не зманіць —
славе славай акурат.
Век сягонняшні — ранейшы.
Бачаць высь чатыры вежы
і адна яшчэ — на ўезд,
што дасюль завецца брамай
і якую лічыць храмнай
нават навакольны свет…
Век не той і дзень другі, —
што за днём і што за векам?
Ваявода Трубяцкі,
атаман Залатарэнка
рушаць? паляць лад ушчэнт?
Так, дашчэнту паляць, рушаць.
Анішто не скажа душам
замак зместам пекнаты.
Чвэрць ён веку — у руінах,
міру так чакаў ў Міры...
<...>
Час — за часам, толк — за толкам:
сінтэз готыкі, барока
і таго, што — гістарызм…
Замак — веліччу прарока,
рэнесанс жыцця — у ім.
І пяцьсот гадоў, напэўна,
а ці больш, калі ўлічыць
тых, імкнуўся хто вяршыць
гонар за яго бязмерна.
Вітгенштэйнаў, Радзівілаў
ды Ільінічаў і Мірскіх,
блізкіх нам у далях звычных, —
скрозь падзячна помнім іх.
Па-за часам — часу сіла,
у якім і дух, і дых…
Раскажы сябе мне, замак,
тут, дзе веж паўднёвы захад,
дзе так вабяць нішы сцен,
сонечным дыханнем злагад
нат расквечваючы цень…
Пакажы цаглін рабрыстасць
у глыбінях паўкалон
або арак водбліск мглісты
з прысутоненых бакоў,
што ўзвышаліся з вякоў…
І паўночнаю сцяною
нагадай, ці быў вайною?
А цяпер ва ўсёй красе
ты ўзлятаеш нада мною,
каб яе ўбіралі ўсе.
Нат глядзяць пагляды храмна,
ды і бачаць панарамна, —
я цябе ў свой не ўмяшчу…
Вось і яўнае не яўна —
з поўдня адшукаць сцяну.
Вежы сціснутыя ёю —
моцнай сілай крапасною
ды прыцэльнасцю байніц
могуць ворага ўсачыць,
ці не блізіцца ўжо зграя
там, дзе луг, дзе глыбі яра…
Я сцяны Усходняй зноў
не ўтаю святло ў паглядзе, —
і яно з тых тут гадоў,
для якіх жыццё-багацце
абазначу рытмам слоў.
Так, для выніку, што мог
бачыць арачны масток, —
да яго скрозь ласку-цішу
я набліжуся, набліжу
вал нябачных мне дарог.
Не, не ўсё ў стагоддзях кане…
У сцяне цаглянай — камень
сцвердзіць чутку з векавых:
барановай галавы
позірк мне з дакорам гляне.
З будаўнічых рыштаванняў,
знаць, і праўда, нехта падаў, —
іх я памянуць гатоў,
хто ўтаіўся за паглядам
барановым… Час прайшоў, —
можа, позірк не ў дакоры?
Адыходжу ад размовы —
міма слёзна-сумных воч
ці то разам з імі ўсё ж.
Вежа віленска-ўязная
і капліца тут святая —
Хрыстафорава яна.
Ну а ён — заступнік Вільні,
княжаскай сталіцы слыннай—
ведаць трэба ёй спаўна.
Я ў зямным забыў спакоі
паміж нейкіх міражоў,
што даўно-даўным ужо
сутнасцю жыццё не тое.
Сённяшнім я гаварыць
аб вяках імкну ранейшых,
а для нас — здавён тутэйшых.
З ім справую іх мірыць —
ды не па календары.
Дзён мільганне ўвачавідкі —
праўдай рознай мільгацяць.
Пагляджу: не замак Мірскі,
а пяць рыцараў стаяць.
Ці радніць мо вежы здатны
з сённяшнім днём учарашні
так па-рыцарску… Як знаць?!.
Узяло мінуллем заўтра…
Дворык нутраны прайду
і, нібы чаго баюся,
ў галерэю паднімуся —
тое ўбачу, што хачу.
А спушчуся — і ў турнірны
гул завабіць замак мірны,
так, у спадчыну вякоў…
Скрыгат дзідаў і шчытоў.
Ярка, гулка, мнагалюдна.
Хоць сябе змагчы — пакутна,
нат сябе… Душа ж — свая.
Але ў кожнага падспудна
на турнірах самалюбна
ўспыхне рыцарскае «я».
Хочацца вярнуцца часу.
Ах, якія твары бачу
у натхненні пекнаты!
Ну а коні, коні, коні,
што з герба святой «Пагоні», —
маскі, шлемы ды шчыты!
Дзень стагоддзе ахапляе…
Чырвань дахаў дых займае.
Блікі ў змрочлівай вадзе —
неба ў ёй плыве кругамі
пад курганнымі валамі
у паўсюднай яснаце…
Сёння ўсё— хаця даўно
і ва ўцямленым спакоі.
«Рэстаўрацыя — адно,
інтэр'ер — зусім другое...» —
так падумаў, а акно
ці абноўленай, ці новай
хаты замкавай — сталовай —
вабы пышна-распісной.
І карцінна, і арлінна,
у разводах яркіх столь —
роспіс бачыцца глыбінна,
а здаецца прастатой.
Можа, у партрэтнай зале
і не стрэну ўсіх, на жаль, я,
ды прыйсці яны памкнуць.
Месца кожнага канкрэтна
тут адпушчана партрэтна —
у надзеі не мінуць,
дзякуючы, абяруць…
Вось і музыка знаёма
зноў вяртаецца законна —
гэта клікнуў замак даль,
і ўсчынаецца святочна
тым вякам падзеяй роднай
велічны зваротны баль.
Усміхаюцца, як дзеці,
ды ўжо выгляд іх шляхецкі, —
адчуваюцца вякі.
Ён у рухах плаўна-рэзкіх…
Блізка — дальні ўсё ж такі…
Адыходжу ў рэха рэха,
дзе мігцела цішыня,
дзе руінная прарэха
не заслона зроку — веха,
і прасторава відна.
Дзе ў стальных даспехах рыцар
па-над безданню-цямніцай
у нябёсы зноў глядзіць, —
не на тое, што прапала,
а што мае потым быць.
Для яго праём гатовы,
памятным стагоддзям роўны…
Мо чакаю я кагось?
Не хачу ў падвал я штось —
ён і славай не ўхвалёны.
Баляваў тут вірам вір.
Гэта знаў не толькі Мір —
грыдняй быў падвал для князя.
Ворагаў тут катаваў
ён адной, ды едкай фразай:
«Што насуперак хацеў
ты маёй законнай волі?!.»
Лепш зірну праз кроны дрэў
пільна ў чуйнасць неба, поля…
Побач вось царква, касцёл,
так, Святога Мікалая,
склеп магільны ўцяўся ў дол —
Мірскіх, што чакалі рая,
Святаполкаў — нам сваіх…
Помнім скрозь удзячна іх
існым спадчынным сваяцтвам.
Вось жыцця дзе пастаянства,
вось Айчыны доля дзе…
Хто адроджвае славянства —
той адроджвае сябе.
І Радзіму — як раскошу.
Так па міласці ўсё Божай
зноў вяртае храму храм,
замку замак славу множыць,
высям, долу, — знаць, і нам…

Пераклад з рускай мовы Соф'і ШАХ

Фота Кастуся Дробава.

Ірына ПОЎХ

***

Вецер
на кавалкі б'ецца
ў шыбу, сыпле смецце
неба і здаецца:
стукаецца сэрца
ў дзверы, каб сагрэцца.

Пусціш мяне?

***

Раструшчыўся дзень на хвіліны,
пульсуюць у венах секунды,
распаўся на атамы болю
даўно непатрэбны гадзіннік.
Кавалкі шкляннога паветра
рвуць лёгкія з трэскам нячутным,
ушчэнт забіваючы горла
чужых брыдкіх слоў павуціннем.
Да хрусту сціскаюцца пальцы,
губляе сусвет раўнавагу,
зламаны зігзаг гарызонту
сцірае мяжу паміж явай
і сном. У раз'юшаным вальсе
абрысы дамоў зруйнаваных
ляцяць да халоднага сонца,
каб разам сысці неўзабаве
ў нябыт.

***

Гутарка сонных дамоў
паступова сціхае.
Гасне акно за акном.
Чуеш, як пазяхае
вецер між цёмных галін?
Лісце шэпча "дабранач".
Ты на хвілінку зірні,
што нам наканавана
за далягляда, куды
мы не маем дазволу:
што адчуваюць лісты,
калі падаюць долу?
Вокны пагаслі даўно,
плача дождж несуцішна.
Зоркі запальвае ноч,
вецер лісце калыша.

***

Дрэвы долу скідаюць
свае сумныя думкі,
спадзяванні і мары,
успаміны і сны.
Дворнік зноў назбірае
лісця поўныя клункі,
каб прынесці ахвяру
богу новай вясны.
Паляціць з алтара
белым дымам малітва –
ды забудуцца слёзы
ў карагодзе падзей.
І нібы першы раз
пераможаны ў бітве,
кіне здзіўлены позірк
анёл на людзей.

***

Восень рыхтуе каву
з печывам шакаладным —
восені нецікава
ўсё, што непадуладна.

Жоўты абрус пасцеліць
з кветкамі – для прыгажосці:
восень даўно хацела
сама да сябе — у госці.

Ціха і ўтульна ў пакоі —
прысмак на вуснах гаркавы.
Дыхае вечар спакоем
з водарам восеньскай кавы.

ПАМІЖ КУБКАМІ І ВУСНАМІ

З новых запісаў

Казімір КАМЕЙША

***

Новы, амаль фантастычны, узлёт навукі. Зноў, да чаго не дадумалася прырода, дадумаўся сам чалавек. Ён любіць дадумвацца там, дзе нешта не дадумана. Стараецца, намагаецца і вымагаецца, і… перабірае меру. Ну, ды гэта яму ўласціва.

***

Дзяўчынка малюе пальчыкам на запацелай шыбіне трамвая нейкага чорціка. З рожкамі, пры ўсмешцы, так, як і ўяўляе яго. Ёсць жа нейкая патрэба ў гэтым. А чалавек ладнага ўзросту пры стажку недапаленых акуркаў сядзіць над аркушам паперы ды нешта незразумелае для сябе выдумляе. І ў гэтым няма ніякай патрэбы.

***

Усе так настойліва шукаюць гэны самы корань зла, быццам даўно ўжо знайшлі корань дабра. А растуць жа абодва заўсёды побач.

***

Ноч кахання для пісьменніка, паводле Бальзака, каштуе паўтома. І няма такой жанчыны, якой варта было б аддаць хоць два тамы ў год. Наўслед за геніем можна было б сцвярджаць, што доўгае жыццё кахання — гэта зусім не шматтомнік. Яно часам ледзьве цягне на томік выбранага.

***

Застаўшыся ў бальнічнай палаце без сведкаў, здзейсніў забойства: забіў муху і падкінуў яе пад ложак суседа: няхай так не храпе ноччу!

***

У народныя прыкметы, хоць і згадваюць іх зрэдку, ужо даўно ніхто не верыць. Не заўсёды вераць і ў сам народ.

***

Глядзеў ён з-пад ілба на гэтага злоснага, малога чалавечка. Так было заўсёды, калі яго крыўдзілі. Цяпер яго не толькі крыўдзілі, ад маленькага чалавечка мог залежаць нават яго лёс. Глядзеў, маўчаў, а думаў чамусьці вось як: «Цікава, якой была некалі яго малпа?»

***

Любоў і нянавісць, дабро і зло, сябра і вораг… Усё гэта такое старое, нават больш старое, чым сама старасць. Але, здаецца, і вечнае… На якіх бы колах ні ехала.

***

Ну і нацярпеўся ж ён, пакуль сядзеў у тым пакутлівым крэсле дантыста, а ў роце яго грымелі зубадрабільныя свярдзёлкі старой бормашыны. А потым за дзвярыма лекаркі яшчэ доўга крыў усё і ўсіх матам. А потым глянуў на шыльду і ўсміхнуўся:

— А што, усё правільна: стаматолаг! Само слова патрабуе ста матаў, тых самых пушчанскіх мацюкоў…

***

Толькі народ называе рэчы сваімі імёнамі. І ніколі не памыляецца. Згадаўся нечакана той самы помнік нафтавіку, што калісьці бачыў я ў Івана-Франкоўску. Вялізны, увесь сіні, аззяны пражэктарамі, чалавек… Мясцовы люд даўно назваў яго Фантамасам. І надта ж трапна.

***

Лета выдалася гарачае. Кожны дзень — сухаветрыца. Хутка ўсё перасохне, а дзе і акамянее. Высыхаюць і мялеюць рэкі. Сохне трава і лісце на дрэвах. Як збавення, чакаем дажджу…

Заязджаў знаёмы ксёндз. Паскардзіўся яму на неміласэрнасць прыроды. «Моліцеся мала», — кажа ён. Калі б так, дык усё можна было б даўно паправіць… Гэта ўжо я сабе кажу.

***

Дровы калоць — не арэхі лускаць. Там ты бярэш на зуб, а тут — на пуп. Пажартаваў гэтак, калі нядаўна калоў упартую і сукастую дзічку-грушыну. І адчулася адразу, які я бездапаможны перад магутнай, кражыстай калодкай, ад якой і калун адскоквае, як той мяч ад падлогі. Паскакаў-паскакаў, пагахаў, папляваў на далоні, але нешта і адкалолася коўзкім ашчэп'ем ля самага непадатлівага сука. Адкінуў убок непераможаны шэры аскабалак — гэтага маёй сілай не возьмеш. Ат, згарыць і так, нідзе не дзенецца! Мне не саступіў, дык зімой у добрым агні згарыць як міленькі. І пашкадаваў раптам, што ўпартасці тае сялянскай у самога малавата. Можа, і згадаў пра яе ўпершыню тут, колючы дровы.

***

Некалі ў дзяцінстве кожную парушынку з маіх вачэй мама выцягвала-вылізвала кончыкам языка. І ці не таму меў я такі ясны зрок? Я згадаў нечакана тое, калі мама пачала слепнуць. Павёз тады яе да мінскіх дактароў. Зрок яе, васьмідзесяціпяцігадовай, мы выратавалі. Тады ж я пачуў ад яе і гэтае прызнанне:

— Свет адразу так зменшыўся і стаў падобны да парушынкі. І тут ты прыйшоў са сваім «язычком». Гэта такі сон мой…

Сон ці не сон, не ведаю. Але філасофія нейкая адразу вымалявалася: калі ўжо і вялікі свет для чалавека робіцца з парушынку, трэба не свет ратаваць, а чалавека ў ім. Бо сам жа чалавек у гэтым свеце і нагадвае толькі нейкую парушынку, якую можа лёгка развеяць нават слабы вецер часу.

***

Тварыць, вытвараць, прытварацца… Якія гучаннем падобныя тры словы! Але каранёвага падабенства — аніякага. У кожным — свой сэнс, свой змест і свой урок для кожнага. Калі першае кліча ў некую хатнюю ціхасць, садзіць за пісьмовы стол, кладзе чысты аркушык паперы, дык другое змушае і ўнутрана здрыгануцца, выклікае мноства сумна-шчымлівых згадак, дзе не надта ўтульна і самому ўспаміну. Бо ў той пашанотнай зале чалавек вытвараў бог ведае што: нёс і ставіў у ганаровы прэзідыум пляшку гарэлкі, а вядомаму класіку ў прысутнасці замежных гасцей падносіў міску нішчымнага баршчу, а потым на стале юбіляра ўскокваў з чаравікамі і пачынаў танчыць… Гэта ўсё трымаецца ў памяці як нейкі нахлёст немагчымага і невытлумачальнага.

А прытварацца… Тое ўдаецца не кожнаму. А калі і ўдаецца каму, дык гэта і бачна адразу, калі толькі глядзець уважліва. Прытвараўся ж бо адзін такім добранькім, нават абдымаў цябе, нават з прышэптам «на вушка», нават цалаваў, а потым выходзіў у іншы пакой і сплёўваў. За гэта ўсё і сорамна не перад ім, а перад чыстым аркушам паперы. Няхай ён будзе і спісаны, але захоўвае сабе чысціню душы таго, хто вадзіў па ім пяром. Як усё ж важна ўмець услухоўвацца ў слова. Яно тут жа кліча на дапамогу памяць, а тая прамым провадам звязана з тваёй душой.

***

Можаце са мной не згаджацца, але я добра ведаю гэта: паэт пачувае сябе пачаткоўцам столькі разоў, колькі садзіцца за чысты аркуш паперы, аж да апошняга. Кожны раз ён творыць свой верш як упершыню. А калі гэта не так — ён проста звычайны падзёншчык, упарты выканаўца сваёй нейкай нормы.

***

— У мікрафон гавары! — крычаць яму з залы. — Нічога не чуваць!..

— А я не хачу ў мікрафон! Я хачу гаварыць да вас!

— Тады ідзі да нас і гавары! Спускайся, спускайся!..

А не ідзе, не пускае сцэна. На ёй жа ён вышэй за тых, хто яго слухае.

***

Урок мовазнаўства ў роднай хаце пачынаецца з пытання бацькі:

— Дык колькі літар у нашым алфавіце, скажы мне?

— Колькі і зубоў у роце!

— Значыць, ты пагэтаму мне і шапляўіш?..

— ?

***

Смешна глядзіцца вясковы мяшкаваты дзядок у модным гарадскім унукавым касцюме. Унукі ўжо даўно апранаюць таго ў сваё неданошанае: «Панапрывозілі мне, ужо і да смерці ўсяго не знашу!» Можна і не пытацца, як жывецца яму. Разумееш і сам: калі не ў сваім касцюме, дык быццам і не ў сваім часе.

***

Буркатлівыя «птушкі міру» так размалявалі памётам балкон тутэйшаму гаспадару, што вымушаны той быў аб'явіць ім бязлітасную вайну. Часам так і пачынаюцца нашы войны.

***

Ранняе, маладое, перажытае, але ўжо далёкае, няўмольна цягне да сябе. Хочацца паехаць, вярнуцца і ў тое, і ў іншае, дзе, магчыма, некалі ты быў самым найшчаслівейшым у свеце. Цягне, як забойцу на месца свайго злачынства. А там заўсёды чакае толькі расчараванне. Таму і згаджаюся з В. Быкавым: «Не трэба імкнуцца насустрач свайму мінуламу».

***

Я думаў, як гэта аддзячыць таму дзеўчаняці, што дапамагла мне нядаўна ў добрай справе. Яму, сведку гэтага, я так і сказаў:

— Добра, падару ёй сваю кніжку. І аўтограф напішу.

— Не, — перасцярог ён мяне, — ты напішы лепш свой аўтограф ёй не на кніжцы, а на шакаладцы!..

Гэтым усё і сказана…

***

Хлопец гэты — поўны гультай. У нас, у вёсцы, гэта слова прамаўляюць з націскам на першым складзе, быццам падкрэсліваючы: «Ух, які гультай!» Сядзіць той гадзінамі на лаўцы пад клёнам ды дрынкае на сваёй гітары, сам не ведаючы што. Паспрабаваў утаймаваць яго чатырохрадковікам:

Музычнаю нудой
Увагі хлопец просіць.
Часамі нота «до»
І просіць ноты «досыць».

Не ведаю, ці дапякло, але перасеў на другую лаўку.

***

Ранішні абразок

Ужо дабравата набрала моцы сонца, але дыханне ў пушчы яшчэ свежае і ранішняе. Скрозь на зямлі росна і халаднавата. Прыкленчыўшы на сівенькі мох, не густа ўсыпаны жаўтаватым бярозавым лістом і налётам шыгалля, рэжу лісічкі. Растуць яны тут сямеіста, цэлымі залатымі яечнямі. Большыя клічуць за сабой меншых, тыя азіраюцца і хаваюцца ў мох. Ад левага вуха шуміць з прыстогнам шаша, а правае слухае, як перашэптваецца кронамі пушча. Зусім бязладная птушыная рознагалосіца. Цяжка і вылучыць з агульнага хору якую-небудзь птушку. І не можа не адгукацца на ўсё гэта ранішняе сама душа. Яна і прасілася сюды, і таму адгукаецца на ўсё сваім спакоем.

***

У кішэні маёй было запрашэнне, але я пачуваўся тут госцем няпрошаным. На мяне і пазіралі як на няпрошанага. А крыху пазней я зразумеў, што не будзе мне дазволу і на маё слова на гэтай вечарыне. І тады я падняўся і, не прыгінаючыся, як гэта робяць уцекачы, пакінуў залу. І гэта маё «выступленне» было ўсімі ўбачана і пачута.

***

Спатыкнуўся ў аўтара аб гэтае — «лёсаносны». Як гэта? Лёс з носам? А чаму не проста — лёсавы?

***

Ліпа — дрэва мяккае і пілкае, нават, можна сказаць, далікатнае. А вось скульптары звяртаюцца да яе неахвотна. Давай ім што-небудзь цвярдзейшае, лепш — дуба. Там, бачыце, характар больш падкрэслены. А я па-ранейшаму закаханы ў сваю бесхарактарную, меданосную ліпу.

***

Сустрэліся выпадкова на гарадскім праспекце.

— Ну, як жыццё?

— Ды так. Няма чым хваліцца.

— А ў цябе?

— Калі ў цябе няма чым хваліцца, дык што я буду злаваць цябе сваёй пахвальбой…

— А як там паэт Н. пачувае сябе?

— Памёр!

— Як памёр? Я ж не так даўно бачыў яго на кірмашы…

— Памёр як паэт!..

Пасмяяліся і развіталіся.

***

Дзверы, што адчыняюцца ў будучыню, не маюць ні шчылін, ні замковых свідравін. І ніколі не падцікуеш, што там, за імі, робіцца. А гадаць, прадказваць — гэта ўсё цыганскія штучкі. Трэба чакаць. А чаканне не ўсім даецца аднолькава лёгка.

***

Гэта толькі ў малечым узросце здаецца, што ад усіх бедаў, жахаў і палоханняў можна ўцячы і схавацца пад коўдру. У старасці коўдра не схавае цябе нават ад простай бяссонніцы.

***

Дарагім Ён лічыўся для Яе, пакуль тая не сталася гандляркай. Рынак дабавіў сваёй солі і ў чалавечыя адносіны. І Ён, дарагі, пачаў у вачах Яе дзешавець. Некалі казала: «Даражэнькі ты мой!» А цяпер ужо нават з прыўсмехам: «Ах, ты дзяшовенькі мой!»

***

Зямны шар сёння перанаселены не столькі людзьмі, колькі машынамі. Чалавеку стала цесна і на зямлі, і на моры, і на небе. Калі чалавеку цесна ў людской грамадзе, ён амаль заўсёды пачынае адбівацца ад цясноцця ўласнымі локцямі, рассоўваючы ўбакі сабе падобных. Машыны, на жаль, не маюць локцяў і рассоўваюць іншае жалеза локцямі тых, хто іх прыдумаў і стварыў, і ездзіць на іх. Мы паціху рухаемся да таго, што хутка ўжо і ў прасторным вясковым дварышчы не будзе месца, каб прыпаркавацца. Дзе выйсце? Няўжо ўцякаць на іншыя планеты? Але да касмічных уцёкаў мы яшчэ не падрыхтаваныя. Таму думайце, і думайце хутчэй, пакуль цесната не расціснула вас у сваіх жалезных абдоймах!..

***

Хваліцца — гэта дрэнная рыса. Але ж гэта рыса, і калі яе падводзяць, дык шмат несуцяшальнага застаецца і па той, і па гэты бок яе.

***

У пачатковай школе яны, паваенныя пераросткі, не адчувалі сябе пачаткоўцамі. У іх за плячыма ўжо была суровая чатырохгодка вайны.

***

Суцяшэнне маладых: і класікі таксама некалі былі пачынаючымі! А як жа!.. Усё ў свеце з нечага пачынаецца. Нават наша смерць пачынаецца з нашага нараджэння. Мы толькі баімся сказаць: «Нарадзіўся той, хто некалі памрэ». Можна ж, вядома, і лягчэй: «Прыйшоў той, хто некалі пойдзе!» Можна дадаць яшчэ і гэта: «Ніколі не трэба спяшацца!»

Майстэрства як галоўны крытэрый

Многія спрабавалі пісаць вершы або прозу. Але сумневы заставаліся: ці сапраўды мая праца годная? Трэба даць пачытаць такім жа аматарам, а яшчэ лепш — прафесіяналу-крытыку… Падобнымі пытаннямі аўтары задаваліся даўно. У Полацку 30 гадоў таму каля дзясятка пісьменнікаў стварылі нефармальнае аб'яднанне, у якім разбіралі сваю творчасць. Праз пяць гадоў з гэтай групы вырас Беларускі літаратурны саюз «Полоцкая ветвь».

Сёння, у юбілейны для арганізацыі год, яна налічвае 120 чалавек, аб'яднаных у 11 аддзяленнях, якія дзейнічаюць па ўсёй краіне. Цяперашні старшыня Беллітсаюза «Полоцкая ветвь» Алег Зайцаў калісьці ўдзельнічаў у яго стварэнні. Будучы студэнтам журфака БДУ і прыязджаючы да бацькоў у Полацк, прынёс аднойчы свае творы для разгляду ў толькі што створаны калектыў. А працягваючы вучобу, перанёс практыку літаратурных сустрэч у альма-матар. У інтэрнаце пры ўніверсітэце збіраў аднакашнікаў для абмеркавання творчасці адно аднаго і падрыхтоўкі калектыўнага зборніка. З цягам часу праектам зацікавіліся не толькі студэнты: на сходы пачалі прыходзіць людзі розных узростаў і адукацыі…

Кола аўтараў, якія хацелі атрымаць канструктыўную крытыку калег па пяры, пашыралася. Аб'яднанне зарэгістравалі афіцыйна. Планка мастацкага ўзроўню была высокая, трэць прэтэндэнтаў адсеялі.

І дзейнасць завіравала. Пачала выходзіць уласная газета «Вестник культуры», наклад якой складаў 11 000 асобнікаў. Стварылі часопіс «Западная Двина». Пазней на змену «Вестнику культуры» прыйшла газета «Слово писателя», якая праіснавала да 2016 года. Саюз пачаў супрацоўнічаць з літаратурнымі СМІ краін-суседзяў.

Цяпер Беллітсаюз «Полоцкая ветвь» штогод праводзіць унутрысаюзны конкурс-біенале «Літаратурная крона», узнагароджвае пісьменнікаў літаратурнай прэміяй Сімяона Полацкага за лепшыя кніжныя навінкі. У склад журы ўваходзяць аўтарытэтныя члены «Полоцкой ветви».

Акрамя таго, саюз «Полоцкая ветвь» супрацоўнічае з Саюзам пісьменнікаў Расіі, Кангрэсам літаратараў Украіны, Южнарускім саюзам пісьменнікаў, Межрэгіянальным саюзам пісьменнікаў (г. Луганск), некаторымі іншымі літсуполкамі, дзякуючы гэтаму пісьменнікі аб'яднання наведваюць замежныя літаратурныя фестывалі. Тройчы трапіўшы на «Славянские традиции» ў крымскае Шчолкіна, беларусы вырашылі стварыць нешта падобнае ў сябе. І ў 2014-м, пасля года напружанай арганізатарскай працы, калег па пяры запрасілі ў Полацк на ўласны літаратурны форум «Славянская ліра».

Пішуць літаратары літсуполкі ў самых разнастайных жанрах: ад аўталагічнай паэзіі да метафарычнай і асацыятыўнай лірыкі, ад дэтэктываў і фэнтэзі да гістарычных раманаў. Галоўны крытэрый — гэта ўзровень майстэрства...

Павел САЛАЎЁЎ

Святаром запаленая свечка

Калекцыя кірылічных кніг (выданні на царкоўнаславянскай мове) Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі налічвае амаль 550 асобнікаў XVI — пачатку XX ст. У асноўным гэта выданні, прызначаныя для богаслужэння.

Фота Алены Цітавец.

Пераплёт. Трыёдзь посная (Масква, 1630).

Не выключэнне і Трыёдзь посная (Масква, 1630), якая здзівіла супрацоўнікаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі нечаканым рукапісным запісам. Гэтая кніга змяшчае парадак богаслужэння на працягу дзесяці тыдняў да Пасхі. Падчас службы спяваюцца каноны, якія складаюцца з трох песень, а назва Трыёдзь атрымалася ад грэчаскіх слоў «тры» і «песня».

Асобнік Трыёдзі поснай бібліятэка набыла ў 1984 г. у букіністычнай кнігарні № 2. Ранейшым яго ўладальнікам быў Фёдар Шкляраў (1925—1988), стараабрадзец, самадзейны мастак, калекцыянер, заснавальнік Веткаўскага музея народнай творчасці. Фёдар Рыгоравіч паставіў на некалькіх старонках асобніка свой адмысловы штамп, на якім — графічная выява Багамаці і побач з ёй запаленыя свечкі. Пад выявай — надпіс: «Г. Ветка. ФЕДОР Шкляров».

На пачатку кнігі Ф. Шкляраў уклеіў дадатковы аркуш, на якім пазначыў папярэдняга ўладальніка: «№ 132.4. Марта 1974 г. книга принадлежала Кузьмину Ивану Дмитриевичу переплетных дел мастеру с дер. Тарасовка. Ф. Шкляров».

На асобніку — пераплёт, зроблены прыкладна ў XVII — першай палове XVIII стагоддзя з дошак, абцягнутых цёмна-карычневай скурай. Ён значна знасіўся, скура пацёрлася, фрагмент карашка згубіўся, адарваліся зашпількі. Хтосьці (магчыма, згаданы «пераплётных спраў майстар» з Веткаўскага раёна) крыху рэстаўрыраваў пераплёт, зрабіўшы новыя раменьчыкі для металічных зашпілек, але няўдала прыбіў іх да ніжняга вечка, у выніку чаго адламаўся кавалак дошкі.

Гартаючы старонкі асобніка, мы пабачылі, што нехта ў XX стагоддзі вельмі ўважліва яго чытаў і выкарыстоўваў у паўсядзённай практыцы. Відаць, гэта быў святар, які падрабязна пазначаў парадак выканання богаслужэння ў розныя дні. Яго запісы, зробленыя на палях, упарта ідуць праз усю кнігу. Амаль на кожным аркушы і сляды ад кропляў свечкі, пры якой раней чыталі кнігу.

І раптам… На адвароце аркуша 472 пад друкаваным тэкстам царкоўных спеваў ад рукі напісаны верш:

Когда-нибудь, страницы книг листая
на отдыхе от будничных забот,
седая память светлый вечер мая
из горькой тьмы забвенья принесёт.

Ты вспомнишь, как среди обыденно ленивых
и праздных будней злого торжества
прошла весна, прошла неторопливой
и гордою походкой божества.

У гэтых паэтычных радках — на жаль, высветліць іх аўтара не ўдалося — духоўны настрой, якім падзяліўся з намі былы ўладальнік кнігі.

Алена ЦІТАВЕЦ,
загадчыца сектара кнігазнаўства
аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі



Запіс, аркуш 472 адваротны.

«ЖЫВАПІС — ГЭТА ПАЭЗІЯ»

У Мінску пабачыў свет каталог работ «Мастак Ніна Сяргееўна Дзябольская»

Рэпрадукцыі 50 работ аб'яднаны ў адным невялікім выданні, якое прэзентаваў чытачу і гледачу выдавец Віктар Хурсік. Ніна Дзябольская вядомая як маскоўская перакладчыца паэтычных твораў Максіма Багдановіча на французскую мову. Мастачка і перакладчыца — сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Каталог падзелены на раздзелы: «Масква», «Пейзаж», «Нацюрморт», «Цэрквы і манастыры». І ў гэтым ёсць свая, вартая ўвагі, логіка адлюстравання мастацкага мыслення аўтара.

Ніна Дзябольская — прафесійны лінгвіст. У 1959 годзе закончыла Інстытут замежных моў па спецыяльнасці «Выкладчык французскай і нямецкай моў». Паралельна займалася ў студыі выяўленчага мастацтва клуба завода «Каўчук» пад кіраўніцтвам выдатнага мастака Іосіфа Рубанава. Дарэчы, Вікіпедыя падказвае, што работа (а можа быць, і работы) І. Рубанава ёсць і ў адным з беларускіх музеяў. Праз такога настаўніка Дзябольская судакранулася і з легендарным Робертам Фалькам, які ў сваю чаргу вучыў Іосіфа Рубанава. Ужо ў 1980-я гады Ніна Сяргееўна закончыла трохгадовае аддзяленне станковага жывапісу і графікі Завочнага народнага ўніверсітэта мастацтваў.

Да каталога пададзены два артыкулы. Аўтар першага (лаканічнага біяграфічнага нарыса «Ніна Сяргееўна Дзябольская») — Н. Драчынская, фатограф, выкладчык фатаграфіі ў Інстытуце гуманітарнай адукацыі г. Масквы. Аўтар другога («Эмацыянальная вобразнасць палотнішчаў Ніны Дзябольскай») — мастацтвазнаўца, член Міжнароднага мастацкага фонду І. Мешчанінава. Другі з іх якраз і пачынаецца такімі радкамі: «У мастацкім асяроддзі ёсць жывапісцы, якія самастойна прайшлі шлях ад аматарскай творчасці да вышынь прафесійнага мастацтва. Іх адрозніваюць не толькі веданне тэхналогіі жывапісу і майстэрства, але і асаблівая эмацыянальная вобразнасць, якая заснавана на жыццёвым вопыце і асаблівасцях тэмпераменту. Яна напаўняе душэўным цяплом і шчырай дабрынёю карціны, якія ўяўляюць сабою непаўторны і самабытны расповед пра час і сябе. І чым ярчэйшае, чым багацейшае па напоўненасці жыццё іх аўтараў, тым цікавей і глыбей яна сягае ў творчасць, часам узыходзячы да вышынь вялікага мастацтва».

Чым мяне асабіста прыцягвае той ці іншы каталог ці мастацкі альбом? Штуршком, вялікім жаданнем пазнаёміцца з арыгіналамі работ мастака, творчасці якога прысвечана выданне. Тое ж і ў выпадку са знаёмствам з рэпрадукцыямі Ніны Дзябольскай. Так і карціць убачыць на адной з выставак у Мінску, Маскве ці ў іншым месцы арыгінальныя творы. Ці «Маскоўскі дворык зімою, 1988 год», ці «Вясну на Дзявочым полі, 1990 год», ці «Горад пад снегам, 1989 год», ці «Выгляд з акна, 1983 год»… Ёсць магнетычны характар у колерах, падараваных гледачам таленавітым творцам. Невыпадкова ў артыкуле І. Мешчанінавай прыведзены словы вялікага фларэнтыйца Леанарда да Вінчы: «Жывапіс — гэта паэзія, якую бачаць, а паэзія — гэта жывапіс, які чуюць».

Вабяць зрок пейзажы Крыма і Падмаскоўя: «Ялта, 1989 год», «Азёры Зарасая», «Рака Істра, 1969 год», «Парк у Ліёне, 1990 год», «Берагі ракі Асётр, 1988 год»… Шырокае, напоўненае прыродным шматабліччам, святло ідзе ад вады і травы, ад дрэў і неба, якія падгледжаны, выведзены ў ролю галоўных персанажаў Нінай Дзябольскай. Праз спасціжэнне прыроды мастачка ідзе да спасціжэння галоўнага, сутнаснага ў творчасці. А раздзел «Цэрквы і манастыры» ўвогуле ўражвае, здаецца, бясконцым пранікненнем у таямніцы спалучанасці прыроды і розных культавых аб'ектаў.

Шкада толькі, што каталог невялікага памеру і выдадзены накладам усяго ў 40 асобнікаў. Веру, што абавязкова павінна прыйсці ў Беларусь выстаўка Ніны Дзябольскай, павінен разам з ёю быць выдадзены новы тыражны каталог, а мо і альбом, які будзе дапаўняць нашу, беларускую, сустрэчу з таленавітым жывапісцам.

Кастусь ХАДЫКА

НЕ ЛЁТАЮЦЬ НІЗКА АРЛЫ

Аляксандр Твардоўскі ўжо ў сталым узросце здаваў уступныя экзамены ў літінстытут. На экзамене па рускай літаратуры выцягнуў білет і прачытаў уголас: «Вобразныя сродкі ў паэме Аляксандра Твардоўскага "Страна Муравия"». Прафесар і асістэнт пераглянуліся і міжволі засмяяліся. Супадзенне незвычайнае. Пры пэўным збегу абставін наш беларускі Ясенін Паўлюк Трус мог бы пры паступленні ў БДУ, як і Твардоўскі, выцягнуць білет, скажам, пра сваю ж паэму «Дзясяты падмурак». Што праўда, то праўда: ад вялікага да смешнага — адзін крок. Зямляк Труса, народны пісьменнік Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат трох (!) Дзяржаўных прэмій (дзвюх усесаюзных і адной беларускай) Кандрат Крапіва надрукаваў у газетах і часопісах больш як дваццаць баек і атрымаў за іх акордам ні грошы, а грашы. Будучы класік пакрыўдзіўся, наняў рамізніка і падаўся ў сваю уздзенскую вёску Нізок. Жаніўся на зямлячцы. І ўжо будаваў дом. Як той казаў, а гэны слухаў: гары яны гарам гэтыя літаратурна-жабрацкія заробкі. А, між тым, Яе Вялікасць Слава ўжо шукала байкара па ўсёй Беларусі. Чытачы закідвалі газеты і часопісы пісьмамі: «Дзе Крапіва? Чаму не піша? Друкуйце Крапіву, а не гарапісак». Будучы аўтар гумарыстычна-прыгодніцкай паэмы пра Дзеда Міхеда, легендарнага, пакладзенага на музыку, верша «Нёман» Анатоль Астрэйка разам з настаўнікам і аднакласнікамі выправіўся за дзесяць вёрст з капыльскага Пясочнага ва уздзенскі Нізок на экскурсію, каб хоць адным вокам глянуць на аўтара «Дыпламанаванага Барана». Адшукалі яго няўрымслівыя экскурсанты, калі той працаваў сякерай на зрубе будучай хаты, у якую меў перабрацца са сваёй маладой жонкай-нізаўчанкай. І перабраўся б, але пашкадаваў чытачоў, вярнуўся ў Мінск. «Слава — дым, — усклікнуў колісь Кузьма Пруткоў, — але гэты дым прыемна казыча ноздры!»

«Няма таго, што раньш было». Як ні крыўдна, але ўжо, бадай, сёння пісьменнікаў не менш, чым чытачоў. Цудаў, як з Твардоўскім, аднавяскоўцамі Трусам і Крапівой, бадай, не здараецца. Так і я думаў да сустрэчы з Аляксандрам Афанасьевічам Верамейчыкам, жыхаром Станькава, пасёлка бліз Дзяржынска.

Афанасьевіч (так яго ў Станькаве называюць усе знаёмыя) быў галоўным аграномам заможнага калгаса, намеснікам старшыні, а на пенсіі стаў самым актыўным чытачом мясцовай бібліятэкі.

«Прабач, дарагі, — сказаў неяк пры нашай сустрэчы Афанасьевіч, — мне падабаюцца твае аповесці, нарысы, але сёння асабіста для мяне празаік нумар адзін у Беларусі…»

Верамейчык прыціх. Кінуў свой дальназоркі пагляд на неба, дзе ў сіняй сінечы кружылі на распасцёртых крылах белагрудыя буслы.

«Уяві, што гэта арлы, — загадкава ўсміхнуўся бібліяфіл, — і ты здагадаешся, хто мой любімы аўтар».

— Тут і гадаць няма чаго, нябось, Ганад Чарказян! — здзівіў я Афанасьевіча. — Яго крытыкі з арлом параўноўваюць. — І працытаваў радкі Барадуліна, прысвечаныя Чарказяну:

Не лётаюць нізка арлы.
Крылаты ў нізіне гіне.
Спачыць на плячы ў скалы
Арлам дазваляюць вышыні.
Абсягу крылам стае
Праводзіць дзень на закоце.
Вартуючы гнёзды свае,
Арлы жывуць у палёце.

— У нашай Станькаўскай бібліятэцы чарга на «Горкі пах палыну». Тройчы перачытваў гэты раман. Бібліятэкарка нават злавала: маўляў, не вы адзін такі разумнік — ахвотных прачытаць і перачытаць Чарказяна мех пад завязку.

І Аляксандр Афанасьевіч, збіваючыся, перасковаючы з аднаго эпізоду на другі, пачаў пераказваць мне змест рамана Чарказяна (даруйце за рыфму). Я не перабіваў дзеда, хоць і сам двойчы з захапленнем прачытаў «Горкі пах…». Сюжэт далёка не просты. Галоўнага героя кнігі, параненага яфрэйтара Глеба Беразавіка, падбірае афганская сям'я. Ён жыве на правах раба. Яго цэняць за працавітасць, дабрыню, павагу да старэйшых. У рэшце рэшт Глеб прымае іслам (інакш не выжыць), жэніцца на дачцэ гаспадара. Нараджаюцца дзеці. Жыві і радуйся, каб не настальгія па радзіме, якая — за тысячы вёрст, а прайсці пяшком пустыню, адолець горы можна хіба толькі ў сне. Дваццаць вёсен не быў дома Глеб і наўрад ці ступіў бы на родны парог, каб не гора горкае. Страшны сель пахаваў пад сабой кішлак. Загінулі цесць з цешчай, жонка. Застаўся жывы наш герой і дзеці, якія гасцілі ў жончынага брата.

Згадалася, як, цудам ацалеўшы ў няроўным баі, салдат «марудна сунуўся па вузкай камяністай сцяжынцы, якая то знікала, то перарывалася, і даводзілася рабіць шырокі рызыкоўны крок, і ён гатоў быў сарвацца і падаць, аплакваючы самога сябе. Нярэдка такія павароты час ад часу паўтараліся адзін за другім. Каб яны адбываліся на роўным месцы, то атрымаўся б афганскі нацыянальны танец — атан». Заплюшчыш вочы і быццам на яве бачыш і адчуваеш мукі чалавека, які гуляе са смерцю ў хованкі.

Мак, лічаць афганцы (і не толькі яны), — кветка забыцця, але наш герой не мог забыць, як пасвіў авечыя атары, як шчыраваў матыгай з гаспадаром з раніцы да вечара на камяністай афганскай глебе, як жыхары кішлака прыгаварылі да смерці збітага амерыканскага лётчыка, які быў упэўнены, што адкупіцца.

Прыказкі, прымаўкі, метафары, эпітэты, выдатна выпісаныя сцэны працы, захады сонца і ўзыходы, непаўторная прырода выклікаюць захапленне. Складваецца ўражанне, што ты разам з героем рамана апынуўся ў далёкім кішлаку.

Глеб вырашае вярнуцца на радзіму, у родную Блонь, а там ужо Бог бацька: паехаць да дзяцей ці прывезці іх у Беларусь. Вайна, у якой ён удзельнічаў, скончылася. Можа, і ўдасца дамовіцца, ды лёгка сказаць, але цяжка дыбаць.

Гэта прымітыўны пераказ вострага, поўнага драматызму сюжэта, дзе кожная старонка кнігі, кожны радок дыхаюць, жывуць сваім жыццём. Выдатнае веданне гісторыі Афганістана, асаблівасцей веры, арыгінальны быт, звычаі, катаржная праца на зямлі простага і гордага народа выпісаны пяром майстра дакладна, ёмка. Застаецца здзіўляцца, як удалося паэту перайсці на вялікую, глыбокую прозу.

Ганад Чарказян дорыць сваю кнігу Міхаілу Мясніковічу. 2017 г.

Міжволі згадваю: у рэдакцыю часопіса «Белая вежа» (орган пісьменнікаў Беларусі і Расіі), дзе я працаваў галоўным рэдактарам, малады аўтар прынёс аповесць аб беларускім салдаце, які трапіў у афганскі палон. Аўтар лічыў, што яго твор (на маю рэдактарскую думку, даволі слабы) ледзь не геніяльны. Каб спыніць спрэчкі, параіў маладому чалавеку прачытаць раман Чарказяна «Горкі пах палыну», каб пасля працягнуць гутарку ў рэдакцыі. Той пагадзіўся і дзесьці праз тыдзень папрасіў вярнуць свой рукапіс.

Адкуль вытокі творчасці Ганада Чарказяна, поспеху і ў крытыкаў, і ў чытачоў?

Нарадзіўся будучы пісьменнік у армянскім сяле Ерасхаун Актамбранскага раёна, што ў Араратцкай Даліне. Менавіта тут знайшоў прыстанішча яго дзед, курд-езід па нацыянальнасці. Гэта субэтнічная група курдаў, якія жывуць галоўным чынам у Іраку і Турцыі, часткова ў Іране, Сірыі, Грузіі, Арменіі. Іх пяць мільёнаў, і размаўляюць яны на адным з дыялектаў курдскай мовы.

Сямігадовы хлопчык на ўсё жыццё запомніў, як дзеці разам з настаўніцай шчыра плакалі па Сталіне. Не забыць першую несправядлівасць, калі выкладчык Ерэванскага педінстытута, даведаўшыся, што Ганад курд па нацыянальнасці, вынес несправядлівы прысуд: «Курд? — кажа. — Тады пераздасі экзамен у наступным годзе!» А да гэтага ў залікоўцы студэнта былі адны пяцёркі. Не думаў, не гадаў, што давядзецца развітацца з інстытутам, і ўжо ніколі не стане настаўнікам. Давялося паступаць у тэхнічнае вучылішча. Пасля заканчэння працаваў токарам на заводзе, служыў у арміі. Бацька быў на сёмым небе ад радасці, калі камандзір часці прыслаў яму цёплы ліст, у якім дзячыў за выдатнае выхаванне сына, поспехі яго аддзялення ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы.

Цяга да вучобы была ў крыві Ганада. Ён завочна закончыў Ерэванскі педтэхнікум, а пазней — будаўніча-педагагічны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута.

Чарказяна заўважыў Пятрусь Броўка. Народнаму паэту патрэбна была дапамога будаўнікоў на дачы. Начальства паслала Чарказяна. Маўляў, паэт паэта зразумее. Броўка спадабаўся пачынаючаму літаратару сціпласцю, дабрынёй. Ён падпісаў выгадную для рабочых дамову. Ганад з рук паэта атрымаў сем ягоных кніг. І гэта было самай каштоўнай узнагародай за шчырую працу.

Броўка, пазнаёміўшыся з вершамі Ганада, як мог падтрымліваў яго. Частыя сустрэчы перараслі ў шчырае сяброўства. Пётр Усцінавіч прадставіў чытачам часопіса «Нёман» вершы Чарказяна, перакладзеныя з курдскай мовы на рускую. Між іншым, ужо цяжка хворы народны паэт напісаў прадмову да першай кнігі Чарказяна, хоць і не змог раздзяліць радасць маладога аўтара пасля таго, як зборнік пабачыў свет. Не стала народнага паэта ў 1980 годзе. У кнізе пра жыццё і творчасць Чарказяна «Цвет дабрыні» Казімір Камейша пісаў: «З любоўю захоўвае Ганад кнігі, якія падарыў яму Броўка. Часта перачытвае вершы паэта, затрымліваецца поглядам на аўтографах. У подпісах, у роўным акуратным почырку захавалася штосьці жывое, броўкаўскае. Захоўваецца ў кватэры і яшчэ адна дарагая рэліквія. Гэта — армейскі бінокль у скураным футарале, даўні падарунак народнага паэта.

З гэткай жа цеплынёй, шчырасцю, як і яго ўшацкі зямляк Броўка, падтрымае пазней Ганада Васіль Быкаў. «Вобразы і думкі Чарказяна, — напіша ён, — добра і згодна кладуцца на душу, лёгка даходзяць да сучаснай свядомасці…»

Ганад Чарказян на радзіме Якуба Коласа. 2017 г.

Ганад — аўтар трыццаці кніг паэзіі і прозы.

— Ты ўсё часцей здраджваеш паэзіі, — пажартаваў я неяк пры адной з нашых сустрэч.

— «Лета к суровай прозе клонят», — працытаваў Ганад Пушкіна.

Так гэта ці не так, сказаць цяжка. Можа, памыляюся, але проза страціла б нямала, каб сын гордага курдскага народа не напісаў апавяданняў, што нагадваюць прытчу, арыгінальных, незвычайных па форме, глыбокіх па змесце раманаў.

Васіль ШЫРКО
Фота Кастуся ДРОБАВА.

ФОРМУЛА ПАМЯЦІ

Незабыўныя фрагменты гісторыі ў палітры творчасці беларускіх аўтараў

Апошнім часам Палац мастацтваў у Мінску ўсё часцей здзіўляе публіку не толькі разнастайнымі праектамі, але і маштабам выставак. Толькі 13 лістапада на адной з найбуйнейшых выставачных пляцовак сталіцы адкрыліся адразу чатыры творчыя праекты, якія складана абысці ўвагай.

1. Самы маштабны з іх — праект «Графіка+», які можа ўразіць разнастайнасцю творчых падыходаў традыцыйнай беларускай школы. Секцыя «Графіка» — адно з найстарэйшых творчых аб'яднанняў Беларускага саюза мастакоў. Сёння яна аб'ядноўвае больш за 80 мастакоў, якія асноўным відам сваёй творчасці лічаць графічнае мастацтва.

Гэтая творчая прастора заўсёды была зонай свабоды і эксперыментаў. Жывапіс, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, фатаграфія, апошнім часам — яшчэ і відэамастацтва і інсталяцыя — дадатковыя грані творчай асобы мастакоў-графікаў.

Выстаўка «Графіка+» дае магчымасць мастакам секцыі, акрамя графікі, прадэманстраваць розныя бакі сваёй творчасці. Яна прысвечана 90-годдзю знакамітых мастакоў-графікаў — членаў секцыі: народнага мастака Арлена Кашкурэвіча (1929—2013) і заслужанага дзеяча мастацтваў Людвіга Асецкага (1929—2005).

Беларуская арт-суполка заўсёды ганарылася айчыннай школай графікі. Ніколі не пачуеш водгукаў дрэнных, негатыўных — толькі добрыя. Сапраўды, у краіне ёсць людзі, якія змаглі ў гэтым кірунку дасягнуць высокага прафесіяналізму, што засведчылі не толькі ў нас, але і за мяжой. І гэты факт выклікае гонар. Старшыня секцыі графікі Беларускага саюза мастакоў Андрэй Басалыга лічыць, што, нягледзячы на поспехі ў развіцці айчыннай школы, трэба карыстацца досведам розных краін, але не губляць індывідуальнасці.

— Праект увабраў усё самае лепшае, што было зроблена ў графіцы за мінулыя гады, — расказвае Андрэй Басалыга. — Аўтары няспынна працавалі і рыхтаваліся да гэтай падзеі. Малюнак, акварэль, эстамп, магчымасці лічбавых тэхналогій — творцы спрабавалі зачапіць тэхнікай, ідэяй, філасофскім падыходам і індывідуальнасцю. Паколькі пад праект была выдзелена абмежаваная тэрыторыя выставачнай прасторы, патрабаванні да твораў былі высокія. Работы адбіраліся па якасці і па часе напісання.

Удзел узялі прадстаўнікі розных пакаленняў. Работы маладых творцаў побач з творамі знакамітых беларускіх графікаў нікольки не саступаюць. Розныя пакаленні захапіліся адной ідэяй. Гэта нагода для не аднаго дыялогу.

— Паколькі ў выстаўцы прымаюць удзел прадстаўнікі маладога пакалення, можна казаць пра давер да іх, — падкрэслівае Андрэй Басалыга. — У маладога аўтара з'яўляецца стымул і цікавасць. Выстаўляць сваю творчасць разам з творамі такога мэтра як, напрыклад, Арлен Кашкурэвіч, — гэта сапраўды дасягненне. Але зараз мне не хочацца дзяліць мастакоў на пакаленні. Мы ўсе калегі і ў гэтай прасторы — на роўных. У дадзеным выпадку вучацца не толькі маладыя, але і знакамітыя майстры графікі спрабуюць зразумець, чым жыве моладзь, як адчувае жыццё. Хоць наша школа дастаткова моцная, мы не павінны замыкацца толькі ў яе рамках. Калі варыцца ва ўласным соку, кроў будзе застойвацца. Павінны быць і запазычанні, і погляды ў сусветную прастору графічнага мастацтва. Трэба не баяцца мяняцца, а нашай школе — спакойна ўспрымаць такую з'яву, як трансфармацыя.

Беларуская арт-прастора добра падрыхтавана і чакае такой штогадовай падзеі ў выставачным калейдаскопе. Многія нашы мастакі-графікі ўжо даўно шырока вядомы ва ўсім свеце. І шматлікія міжнародныя ўзнагароды — таму пацвярджэнне. Значыць трэба і нам ведаць, бачыць і цаніць сваіх майстроў графікі.

2. Другая па маштабе выстаўка ў Палацы мастацтваў прысвечана творчасці вядомага мастака Віктара Ціханава (1955—2018), чый жывапіс непарыўна асацыіруецца са шматжанравасцю. Ён ствараў не толькі жывапісныя палотны, але і фрэскі, вітражы, мазаікі. Яго яркія вядомыя садова-паркавыя пейзажы часам параўноўваюць з карцінамі французскага постімпрэсіяніста Поля Сіньяка.

Алесь Лось «Красавік, ранак». 2002 г.

Віктар Ціханаў нарадзіўся ў вёсцы Пукшына на Віцебшчыне. Скончыў Рэспубліканскую школу па музыцы і выяўленчым мастацтве, у 1978-м — аддзяленне манументальнага жывапісу Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). З 1984-га — сябра Саюза мастакоў. Знакавымі ў творчасці сталі работы ў адноўленай ім тэхніцы разнога ляўкаса. Сярод першых работ — партрэт бабкі Ганны і дзеда Сцяпана, пазней энцыклапедычныя Мікола Гусоўскі і Францыск Скарына, партрэт Кастуся Каліноўскага і іншыя. Быў у Віктара Ціханава і перыяд, звязаны з іканапісам: роспісы праваслаўнага храма вёскі Сямятычы (Польшча), алтарная ікона «Хрышчэнне Гасподняе» храма Марыі Магдаліны ў Мінску. Пасля шматлікіх манументальных аб'ектаў у тэхніцы вітражу, мазаікі, фрэскі мастак прыйшоў да жывапісу пазнавальных у яго адметнай манеры краявідаў.

Пуантылізм як стыль не стаў самамэтай для Віктара Ціханава. Праца з мазком рознага маштабу хутчэй прыйшла ад гульні ў рознакаляровую смальту і маленькіх кропак вітражнага шкла. Пасля ранніх шэра-ссівелых беларускіх краявідаў сапраўдны прарыў святла і колеру літаральна захлынуў мастака ў Іспаніі ў 1994 годзе. Пасля працы і шматлікіх выставак у Іспаніі палітра аўтара кардынальна змянілася.

Кожная вандроўка аўтара вылівалася ў новую серыю твораў. Так з'явіліся «Швейцарскі цыкл», «Восень у Баварыі», серыі палотнаў з Сербіі і Славакіі. Пасля вяртання з гор беларускія прасторы з люстэркамі рэчак і азёраў зноўку вабілі мастака. Складаная і балючая тэма Чарнобыля знайшла свой водгук у творчасці. Паездкі ў забароненую зону адлюстраваліся ў аўтарскім фільме «Сум пакінутых вёсак» і аднайменным праекце, які быў прадстаўлены ў Нацыянальным мастацкім музеі ў 2007 годзе.

Яўгенія Ліс «Сустрэча». З серыі «Жаночыя мары». 1998 г.

Святло можна назваць галоўнай тэмай пуантылістычнага жывапісу Віктара Ціханава. Гэта мігценне першага снегу на коўдры жоўтага лісця, блікі на вадзе беларускіх ручаёў і Міжземнага мора. Нават калі за аснову абраны чорны квадрат, мазком праступае святло.

3. Трэцяя выстаўка ўяўляе сабой сінтэз жывапісу і графікі «Залессе. Алесь Лось. Яўгенія Ліс».

Чым больш роляў мы на сябе прымяраем, тым больш рухаемся наперад і пазнаём свет. Творцы праяўляюць сябе ў розных формах мастацкай дзейнасці (а не толькі ў межах прафесійнай галіны, дзе атрымалі адукацыю). Адзін з такіх прыкладаў — творчасць прафесійных мастакоў-графікаў Яўгеніі Ліс і Алеся Лася. Яўгенія адкрыла ў сабе талент рэжысёра батлеечнага тэатра, развівалася як актрыса, рабіла лялькі і пісала сцэнарыі. Алесь навучыўся рабіць музычныя інструменты і іграць на іх, аднавіў беларускую дуду, ліру, стварыў не адну музычную капэлу.

Выстаўка «Залессе. Алесь Лось. Яўгенія Ліс» — адлюстраванне перыяду творчага жыцця маладых мастакоў у вёсцы Зарудзічы Залескага сельскага Савета. Батлейка памяняла ракурс творчасці мастакоў, якіх захапілі выраб лялек, напісанне новых сцэнарыяў для спектакляў, экспедыцыі і знаёмства з традыцыйнай музыкай і спевамі. Дзякуючы батлейцы, у Залессі з'явілася Школа мастацтваў у Палацы М. К. Агінскага, загучалі дуда і ліра карбовая, знайшліся цудоўныя народныя музыканты: скрыпачы, цымбалісты, акардэаністы, якія адкрылі непазнаны свет народнай творчасці для мастакоў-графікаў. Не ўсё атрымалася зрабіць згодна з планам, але Залессе стала яшчэ адной акадэміяй жыцця, пазнання саміх сябе і наваколля.

Ігар Гардзіёнак — Вольга Кірэва «Кветкавы накцюрн № 2». 2019 г.

Дамінантай выстаўкі стала тэма Дзядоў — калі мёртвыя прыходзяць да жывых. Гэта час успомніць пра тых творцаў, што былі разам з намі, сваякоў, родных, сяброў музыкаў. Гэта час ушанаваць памяць таленавітай мастачкі Яўгеніі Ліс, якая 10 гадоў таму адышла ў іншы свет.

Мастак не можа спыніцца ў творчых пошуках. Работы, выстаўленыя Алесем Ласём, інспіраваныя не толькі залескім перыядам жыцця, — дэманструюць прыгажосць Налібоцкага краю і старой Літвы, у цэнтры якой месціцца яго сядзіба «Хутар Дудара» з адзіным у Беларусі жывым музеем музычных інструментаў і тэатрам «Батлейка», якія прыцягваюць сотні зацікаўленых гледачоў.

У экспазіцыі прадстаўлена каля 50 жывапісных і графічных работ Алеся Лася і Яўгеніі Ліс, а таксама серыя малюнкаў лялек і самой батлейкі з фондаў Ленінградскага музея этнаграфіі народаў СССР, якія выкладчык кафедры графікі БДТМІ Людміла Міхайлаўна Кальмаева (сяброўства з ёй і паспрыяла захапленню яе народным лялечным тэатрам) зрабіла яшчэ ў 1966 годзе.

4. Апошняя выстаўка таксама мае вялікае значэнне для беларусаў. Праект «Праўда пра Курапаты» бярэ за душу. Дакументальна-мастацкая выстаўка адлюстроўвае гісторыю і сённяшні дзень старога хваёвага лесу на паўночна-ўсходнім ускрайку Мінска, дзе ў 1930-я гады былі расстраляны сотні тысяч ні ў чым не вінаватых мірных людзей — нашых продкаў і суайчыннікаў.

На выстаўцы прадстаўлены жывапіс, графіка, скульптура, плакат, фотадакументы. Свае новыя творы паказалі вядомыя мастакі: Эдуард Агуновіч, Віктар Мікіта, Аляксей Марачкін, Ніна Сакалова-Кубай, Генадзь Драздоў, а таксама маладзейшае пакаленне сяброў Беларускага саюза мастакоў. Сярод іх — Усевалад Свентахоўскі, Наталля Піневіч, Уладзімір Лавецкі ды іншыя.

Падчас выстаўкі ў палацы мастацтваў адбыліся і яшчэ адбудуцца сустрэчы, экскурсіі і прэзентацыі кніжных выданняў. На ўрачыстым адкрыцці выстаўкі з прывітальным словам выступілі пісьменнік Уладзімір Арлоў і мастак Аляксей Марачкін.

Вікторыя АСКЕРА

Драма мовай танца

— Калі я ставіла спектакль, то перш за ўсё мяне хваляваў момант шчырых пачуццяў. Раней стараліся паказаць гісторыю любоўнага трыкутніка. Я ўзняла канфлікт — маці і палюбоўніцы, — патлумачыла Вольга Костэль. — Гэта тое, што Ганна не магла ў сабе сумясціць. Я старалася гэты канфлікт максімальна раскрыць за кошт прысутнасці яе сына. У юнага артыста — сапраўды важная роля, ён не стаіць на заднім плане.

Ставілася мэтай захаваць дух мінулай эпохі, што ў стваральнікаў спектакля атрымалася: вытанчаныя ўборы, чароўны рух артыстаў балета, якія перадаюць найтанчэйшыя адценні пачуццяў і перажыванняў, цікавыя знаходкі ў дэкарацыях і святле ствараюць атмасферу шыкоўнага балю, таямнічага кутка для сустрэч закаханых. Цудоўная музыка настолькі па-майстэрску ўплеценая ў агульную канву спектакля, што гледачы не заўважаць швоў. Няма адчування дысанансу.

— Спектакль — пра канфлікт жывога чалавека і механічнага грамадства, жывога пачуцця і псеўдамаральнасці, — адзначыла балейтмайстар-пастаноўшчык. — Ганна — жанчына моцная, і застаецца такой да канца, цалкам усведамляючы як свае ўчынкі, так і іх наступствы. Яна не прымае пазіцыі ахвяры. Мы сённяшнія жывём так сама складана, як героі Талстога. Як наогул у такіх сітуацыях трэба сябе паводзіць? Замест арыгіналаў нам пастаянна падсоўваюць эрзац і кажуць: гэта і ёсць шчасце. А калі прыходзіць бяда, людзі шукаюць адказы на свае пытанні менавіта ў Талстога.

У першым дзеянні шмат кахання і страсці, а ў другім, як водзіцца, надыходзіць момант расплаты. Грамадства пагарджае галоўнай гераіняй, ёю пачынае гнясціся і некалі палкі закаханы. У сям'і таксама замест падтрымкі яна становіцца непажаданай персонай. Якімі выразнымі сродкамі перадаць пакуты душы галоўнай гераіні? Сплаў танца, музыкі, акцёрскай гульні складана апісаць, як і момант, калі руйнуюцца мары, здраджваюць блізкія, няма падтрымкі і надзеі... Гэты момант не пакідае гледачоў абыякавымі. Спектакль рухаецца да трагічнага фіналу. Апускаюцца асвятляльныя прыборы, з'яўляюцца клубы дыму і гукі, што сімвалізуюць набліжэнне жалезнага монстра, які знішчыць галоўную гераіню, а далей — нечаканы ход рэжысёра-пастаноўшчыка, які варта ўбачыць на ўласныя вочы.

Усе сцэны ў новым спектаклі — нібы літары, што паўсталі з несмяротнага рамана: вось дамавітая Долі Аблонская (Ганна Фокіна) у атачэнні дзяцей і нязнаснага Сцівы (Антон Краўчанка), а вось наіўная Кіці Шчарбацкая (Вікторыя Трэнкіна), побач з ёю Левін (Канстанцін Геронік). Яна кахае Вронскага (Ігар Аношка), а той заглядаецца на замужнюю Карэніну (Ірына Яромкіна).

Фота Ганны Замкадзь.

На працягу двух гадзін глядач бачыць узлёты і падзенні герояў рамана, калі ў адной сям'і — шчасце, у іншай зразумела — бяда. І так па коле. У эпіцэнтры ўсяго Ганна Карэніна, якая не можа выбраць: быць з сям'ёй або аддацца запалу. У спектаклі атрымалася ўсё. І сапраўды, уражвае гарачае адажыа Ганны і Вронскага. У нейкі момант гледачу можа здацца, што ён бачыць нешта забароненае. А пакуты Ганны ў карціне, калі Вронскі яе вязе, а сын Сярожа спрабуе ўтрымаць, і зусім выклікаюць слёзы.

Вядучы майстар сцэны балета Вялікага тэатра Беларусі Антон Краўчанка распавёў, што першапачаткова рэпеціраваў ролю Карэніна, але яго самога ўражвалі пачуццёвыя адажыа Вронскага і Ганны. І вось воляю лёсу ўсё змянілася.

— На сцэне глядач убачыць два ўзрушальныя адажыа Вронскага і Ганны. Першае — больш гарачае, другое — халоднае. Пасля першага, упэўнены, не застанецца пытанняў, чаму Ганна кінулася з галавой у адносіны, — упэўнены Антон Краўчанка. — Думаю, што кожны ў спектаклі знойдзе нешта сваё.

Канфлікт паміж Ганнай і яе мужам Аляксеем Карэніным на сцэне разгараецца вельмі моцна, а пакутуе ад гэтага сын Сярожа. Дарэчы, адна з самых кранальных і эмацыянальных сцэн спектакля звязана з расставаннем маці і сына. Галоўнай гераіні не ўдаецца ўраўнаважыць у сабе іпастасі маці і палюбоўніцы. Выбар аказваецца трагічны...

Пастаноўка «Ганны Карэнінай» у Вялікім тэатры Беларусі была задумана некалькі гадоў таму. Па прызнанні Вольгі Костэль, першыя думкі пра балет узніклі шэсць гадоў таму, а крышталізацыя канцэпцыі заняла каля трох гадоў. Важна, што ўжо на самым пачатковым этапе працэс стварэння быў падтрыманы неабыякавымі людзьмі: на фарміраванні лібрэта адбіліся плённыя зносіны з перакладчыкам і драматургам Ірынай Герасімовіч, больш глыбокаму асэнсаванню твораў Чайкоўскага дапамагалі гутаркі з кампазітарам Кастусём Яськовым. Далей на працы сканцэнтравалася асноўная пастановачная група.

Музычная кампазіцыя балета «Ганна Карэніна» фарміравалася паступова і была ў выніку істотна перагледжана ў параўнанні з зыходным праектам. Першапачаткова планаваны матэрыял — тры апошнія сімфоніі Чайкоўскага — быў дапоўнены часткамі сімфоній «Манфрэд» і «Зімовыя мроі». Нязменным застаўся прынцып беражлівага падыходу да музычнага тэксту: часткі сімфоній практычна не падвяргаліся скарачэнню і ніяк не відазмяняліся.

— Мы можам шмат разважаць пра Чайкоўскага як культурную з'яву, але кампазітар кожны раз нараджаецца тады, калі гучыць яго музыка, — упэўнены дырыжор-пастаноўшчык Андрэй Галанаў. — І кожны раз інтэрпрэтацыя, умовы выканання ствараюць новае яго аблічча. Музыка Чайкоўскага перадае сам дух часу рамана «Ганна Карэніна». Аб'ядноўваючы творы Чайкоўскага і Талстога, мы аб'ядноўваем эстэтыку літаратурнай і музычнай моў таго часу.

Сцэнаграфія напоўнена сімваламі: месца дзеяння — вакзал — сімвалічная прастора разыходжання шляхоў, разрыву сямейных адносін; люстэрка — унутранае адлюстраванне герояў, іх сумленне; валізкі — атрыбуты вакзала і метафарычны выраз тых цаглінак, з якіх складваюцца сямейныя каштоўнасці.

«Ганна Карэніна» — назва для Вялікага тэатра Беларусі новая. І, тым не менш, гэты балет стаў ужо для тэатра спектаклем асаблівага лёсу — апошняй работай галоўнага мастака Аляксандра Касцючэнкі, які пайшоў з жыцця за некалькі месяцаў да прэм'еры. У сцэнаграфіі майстар хацеў увасобіць і адмысловы каларыт, і пранізлівы твор Талстога, і сімволіку дарогі, і дыялектыку ўнутраных і знешніх адлюстраванняў, і саму псіхалогію разрыву — адносін і жыццяў.

Вікторыя АСКЕРА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

IFMC. СУСТРАКАЙЦЕ СВЯТА ГРАЦЫІ

Харэаграфія — своеасаблівы від мастацтва, які спалучае выпрабаванні магчымасцяў і чалавечага цела, і чалавечага розуму. Сучасны танец — не менш канцэптуальная, унікальная і сэнсава напоўненая з'ява, чым любое іншае мастацтва. Упэўніцца ў гэтым змаглі гледачы Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі (IFMC), які 32-гі раз праходзіць у Віцебску. Першыя дзесяць гадоў свайго існавання віцебскі фестываль быў адзіным такім маштабным мерапрыемствам, прысвечаным сучаснаму танцу, на тэрыторыі былога СССР. У гэтым годзе форум наведалі ўдзельнікі з Бельгіі, Германіі, Ізраіля, Іспаніі, Італіі, Літвы, Нідэрландаў, Польшчы, Расіі, Украіны і Францыі.

Падчас адкрыцця старшыня журы — мастацкі кіраўнік тэатра «Кіеў модэрн-балет», харэограф Раду Паклітару — звярнуўся да ўдзельнікаў: «Мы абяцаем адкрыць сэрцы насустрач вашай творчасці. Пакарыце нас!»

А намеснік міністра культуры Беларусі Наталля Карчэўская ў сваім прывітальным слове адзначыла:

— Сёння вялікае свята для гледачоў. Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі (IFMC) — гэта культурны брэнд Беларусі. Мы робім усё, каб нашу краіну, харэаграфічнае мастацтва ведалі ва ўсім свеце.

Асаблівасцю сёлетняй цырымоніі адкрыцця стала тое, што яна абышлася без прадстаўлення калектываў-удзельнікаў. У першы дзень мерапрыемства адбылася прэзентацыя фотапраекта Ігара Гусакова і выстаўкі скульптур Сяргея Сотнікава «На краі сусвету».

Сёлета ў межах фестывалю праходзіў і конкурс беларускай харэаграфіі, які праводзіцца раз на два гады: чаргуецца з міжнародным. З 34 калектываў-удзельнікаў да фіналу дайшлі 25, сярод якіх чатыры з Віцебска: праект «*Renovation*», калектыў сучаснай харэаграфіі «МаКраСвет», тэатр-студыя сучаснай харэаграфіі Дзіяны Юрчанкі і школа танца «Менада». Фінал конкурсу адбудзецца 22 лістапада.

Сапраўдным святам для гледачоў стаў пластычны спектакль «Ганна Карэніна» на музыку Альфрэда Шнітке, які прадставілі артысты Маскоўскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Вахтангава. На мову танца вядомы раман Льва Талстога пераклала літоўскі рэжысёр Анжаліка Холіна.

Акрамя яго, у праграме фестывалю было паказана яшчэ пяць разнастайных харэаграфічных пастановак. Балет «Вій» па матывах аповесці Мікалая Гогаля ў інтэрпрэтацыі рэжысёра Раду Паклітару прадставілі ў Беларусі двойчы: 19 лістапада — у Віцебску і 20 лістапада — на сцэне Вялікага тэатра оперы і балета ў Мінску. Павольны дуэт «*Sweat baby sweat*», пастаўлены бельгійскім рэжысёрам Янам Марцэнсам, заснаваны на розных мовах руху: бутo, ёга, цыркавая акрабатыка, рок-н-рол. Яго можна было ўбачыць на сцэне Абласной філармоніі ў Віцебску 20 лістапада. Тэатр «Балет Яўгенія Панфілава» прадставіў адразу дзве аднаактовыя пастаноўкі: «Лабірынт», часткова заснаваны на апавяданні Эдгара Алана По «Маска чырвонай смерці», але са своеасаблівай сюжэтнай лініяй, створанай рэжысёрам Аляксеем Растаргуевым, і «Чалавек паветра» — спектакль з цыкла «Літаратурны курс», натхнёны творчасцю Рэнэ Магрыта. Спектаклі суправаджалі этапы фіналу беларускага конкурсу харэаграфіі.

Фота БелТА.

Выступае майстэрня сучаснага танца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў пад кіраўніцтвам Міхаіла Камінскага.

На ўрачыстым закрыцці форуму 23 лістапада будуць аб'яўлены пераможцы конкурсу, а пасля гледачоў чакае сапраўдны падарунак: «*Oskara*» — найлепшы спектакль міжнароднага форуму танца *Tanzmesse-2018* у Дзюсельдорфе. Яго прадставіць іспанская кампанія танца *Kukai Dantza*.

Дар'я СМІРНОВА

«Лістапад-2019». Постскрыптум

Чым запомніўся сёлета галоўны кінафорум краіны?

Кінафестываль «Лістапад» ужо даўно не проста доўгачаканая падзея для Мінска, але і магчымасць на будучы год скласці плэй-ліст фільмаў, якія атрымалі прызнанне на розных кінематаграфічных пляцоўках. Сёлета фестываль прайшоў з 1 па 8 лістапада. На цырымоніі закрыцця ў кінатэатры «Масква» ў прамым сэнсе спела цяжкае воблака інтрыгі: было цікава, каму ж дастанецца Гран-пры. Сёлета фестываль паказаў больш за 150 фільмаў з 50 краін. Упершыню прадставілі карціны з Судана і Сенегала.

Зараз Міжнародны кінафестываль «Лістапад» — адзін з самых буйных у краінах СНД, з пяццю конкурснымі праграмамі і вялікай колькасцю пазаконкурсных секцый. Ігравое кіно для гледачоў традыцыйна больш прывабнае, але беларускія куратары крочаць у нагу з часам і вялікую ўвагу надаюць і неігравому. Палова карцін усёй праграмы — гэта кіно дакументальнае. Больш за тое, хацелася б адзначыць, што сама дакументалістыка Беларусі з кожным годам становіцца усё больш якаснай і змястоўнай — фільмы нашых суседзяў актыўна змагаюцца за прызы на сур'ёзных міжнародных праглядах і часта перамагаюць.

— Сёлетні фестываль атрымаў каля тысячы заявак. Нейкая астранамічная лічба, у якую цяжка паверыць, таму што яна амаль у два разы перавысіла звычайную колькасць, — расказаў праграмны дырэктар фестывалю Ігар Сукманаў. — І адабраць 150 карцін з тысячы — значыць крыху больш за 10 працэнтаў ад таго, што мы маем... Справіцца з гэтым у адзіночку — задача амаль непад'ёмная, таму трэба выпрацоўваць новыя крытэрыі пры адборы. Раней у мяне быў прынцып глядзець усе карціны ад кропкі да кропкі. Незалежна ад таго, падабаецца мне фільм ці не, падыходзіць ці не падыходзіць. Цяпер трэба дзейнічаць інакш. Але ўсё роўна я не магу губляць нюх. Нават калі з кімсьці раішся, ты павінен быць у тэме.

Такім чынам, Гран-пры «Золата Лістапада» за найлепшы фільм атрымаў украінскі рэжысёр Валянцін Васяновіч за карціну «Атлантыда». Гэты фільм хоць і фантастычна, але асацыятыўна дапамагае паглыбіцца ў свет гучных, але складана зразумелых падзей. Дзеянне ў «Атлантыдзе» развіваецца ў 2025 годзе. Карціна распавядае пра будучую перамогу Украіны ў вайне з Расіяй і вяртанне акупаванага Данбаса. Праўда, яго тэрыторыя ўжо прызнана непрыдатнай для пражывання, а навакольнае асяроддзе настолькі спустошана, што змены здаюцца немагчымымі.

— Карціна пра тое, што з'яўляецца асноватворным для чалавека. Гэта тэмы жыцця і смерці, кахання, — адзначае Ігар Сукманаў. — Акрамя таго, гэтая карціна вельмі прафесійная з пункту гледжання рэжысуры. Яна лаканічная, адкідвае ўсё непатрэбнае, акцэнтуючы ўвагу на галоўным. Мне здаецца, што гэты твор як універсальны, так і актуальны: нават у святле тых падзей, якія адбываюцца цяпер па суседстве.

Кадр з фільма «Атлантыда».

Уладальнікам узнагароды за найлепшую рэжысуру стаў Ян Комас з фільмам «Цела Божае», гэты ж фільм адзначылі спецыяльным прызам журы. Узнагароду за найлепшы сцэнарый уручылі Дзмітрыю Мамулія і Арчылу Кікодзэ з фільмам «Злачынны чалавек». Гэтая карціна таксама адзначана за найлепшае гукавое рашэнне. Прыз імя Юрыя Марухіна за найлепшую аператарскую работу атрымаў Кім Хён Сок з фільмам «Бывай, сын мой» рэжысёра Вана Сяашуай (Кітай).

Найлепшую жаночую ролю, на думку журы, сыграла Саломэ Дэмурыя ў фільме «Удых-выдых» (рэжысёр Дзіто Цынцадзэ; Грузія, Расія, Швецыя), а мужчынскую — Леван Гелбахіян у карціне «А потым мы танцавалі» (рэжысёр Леван Акіна; Швецыя, Грузія, Францыя).

Дыпломам «За душэўнасць у інтэрпрэтацыі народнага вобраза» ўганаравана Алена Сусаніна: фільм «Газа» (Расія). Дыплом «За пашырэнне межаў візуальнага мастацтва кіно» атрымала Валерыя Гай Германіка (карціна «Думкавы воўк» (Расія)).

Кадр з фільма «Рока змяняе свет».

У асноўным конкурсе ігравога кіно сёлета ўдзельнічалі 12 фільмаў, якія ацэньвалі Карлас Кінтэла (Куба) — старшыня журы, Алена Яршова (Украіна), Юрга Дзікчувіене (Літва), Уладзімір Янкоўскі (Беларусь), Ларыса Малюкова (Расія).

— Гэта было вельмі моцнае спаборніцтва, высокі ўзровень фільмаў. Стужкі ўнікальныя. Калі ацэньваць конкурсныя работы па 10-бальнай шкале, то я б паставіў ад 8,5 да 10 балаў, — патлумачыў на цырымоніі закрыцця Карлас Кінтэла. — Было даволі складана. У нас 5 членаў журы, мы шмат абмяркоўвалі і праз 7-8 гадзін усё ж выбралі пераможцаў.

Традыцыйна ўдзельнікам кінафестывалю ўручылі спецыяльныя прызы. Прыз Прэзідэнта Беларусі «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве» атрымаў заслужаны польскі рэжысёр Кшыштаф Занусі, які сёлета — ганаровы госць фестывалю. Дарэчы, нядаўна ў кінатэатры «Піянер» у Мінску адбыўся спецыяльны паказ яго прэм'ернай карціны «Эфір».

Уладальнікам прыза Прэзідэнта Беларусі «За гуманізм і духоўнасць у кіно» стаў Хуан Хуан — рэжысёр і сцэнарыст фільма «Ушу-сірата» з Кітая.

Акрамя асноўнага конкурсу ігравога кіно, на фестывалі прайшлі яшчэ чатыры конкурсныя праграмы — міжнародны конкурс дакументальнага кіно (пераможца — «Наша машына часу», рэжысёры — Ян Сунь, С. Леа Чыян; Кітай); конкурс ігравога кіно «Маладосць на маршы» (пераможца — «Ліліян», рэжысёр — Андрэас Харват; Аўстрыя); а таксама конкурс кінашкол і нацыянальны конкурс беларускіх ігравых, дакументальных і анімацыйных фільмаў. У апошнім журы пад старшынствам Кшыштафа Занусі прызнала першынства наступных карцін:

Найлепшы гульнявы фільм — «Пляж / Лес / Тамбур» (рэжысёры Кірыл Галіцкі, Святлана Казлоўская; Беларусь); найлепшы дакументальны фільм — «*Summa*» (рэжысёр Андрэй Куціла; Польшча, Беларусь); найлепшы анімацыйны фільм — «Магістр вольных мастацтваў» (рэжысёр Алена Пяткевіч; Беларусь); дыплом «За аператарскую працу» — Саша Кулак: «Хронікі ртуці» (ЗША, Расія).

Кожны раз «Лістапад» становіцца лакмусавай паперай таго, што адбываецца ў нашым жыцці. Беларусы з пачатку продажу скупляюць квіткі, таму што ведаюць: якаснае кіно — у пэўным сэнсе спосаб адраджэння. Прызнанне прафесіяналаў кінематографа для аўтараў фільмаў заўсёды важна, аднак адной з самых прыемных узнагарод застаецца прыз сімпатый глядачоў. На адкрытых кінапаказах на працягу фестывалю гледачы выстаўлялі фільмам конкурсныя адзнакі. І мы вырашылі больш падрабязна расказаць пра стужкі, якія зачапілі публіку.

Прыз сімпатый гледачоў за найлепшы фільм для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі ў конкурсе «Лістападзік» атрымаў фільм «Рока змяняе свет» (Германія, 2019) Каці Бенрат. Стужка цікавая нават для дарослых.

У цэнтры ўвагі — 11-гадовая дзяўчынка Рока, у якой займальнае жыццё. Яе тата астранаўт. Ён працуе на касмічнай станцыі ўдалечыні ад Зямлі і не заўсёды можа быць побач. Рока пераязджае да бабулі і ўпершыню ў жыцці ідзе ў школу. Дзяўчынка больш за ўсё на свеце шануе справядлівасць, таму заўсёды аказваецца ў цэнтры ўвагі. Яна ўвязваецца ў канфлікт з задзіракамі з класа, заводзіць сяброўства з бяздомным Каспарам, даглядае вавёрку і імкнецца заваяваць любоў сваёй эгаістычнай бабулі. Аптымістка Рока ў кампаніі сяброў гатовая даказаць усім, што нават дзіцяці пад сілу змяніць свет.

Гэтая філасофская і дынамічная карціна дазваляе акунуцца ва ўспрыманне свайго свету. Адразу ўспамінаеш сваё дзяцінства, праводзіш паралелі паміж фарміраваннем унутранага я і сучасным станам. Фільм варты прагляду, ён увогуле можа заняць адно з месцаў у хатнім кінаплэй-лісце для агульнага развіцця сям'і.

«Найлепшым дакументальным фільмам» на «Лістападзе» прызнана карціна «Эйфарыя быцця» (Венгрыя, 2019 г.) рэжысёра Рэкі Сабо. Яна якраз дае адчуванне трапятання ад таго, што адбываецца на экране.

Галоўнай гераіні Эве Фахідзі было дваццаць гадоў, калі яна вярнулася ў Венгрыю з Асвенцыма, вярнулася зусім адна. Шматлікая радня — усе сорак дзевяць чалавек — была знішчана; маці, бацька, малодшая сястра — усе загінулі. Праз семдзесят гадоў Рэка Сабо, рэжысёр, запрашае Эву прыняць удзел у танцавальным спектаклі, прысвечаным яе жыццю. Рэжысёр разумее, наколькі моцным будзе дуэт дзевяностагадовай Эвы і маладой танцоркі Эмешэ, уяўляе іх узаемадзеянне на сцэне, перапляценне целаў і лёсаў. Эва згаджаецца адразу. Тры жанчыны, тры месяцы рэпетыцый і іх гісторыя пераадолення межаў.

Складана сказаць, што гэтая гісторыя накіравана на дыялог паміж аўтарам і гледачом. Тут хутчэй пераважае візуальная эстэтычная частка. Фільм пабудаваны на своеасаблівых момантах імпульсу, усплёску, што дазваляе апынуцца ўнутры карціны, адчуць пэўны стан напружанасці, гармоніі, цяпла.

«Найлепшым ігравым фільмам», на думку гледачоў, стала карціна «Цела Божае» Яна Комасы. Мабыць, сюжэт гэтай конкурснай стужкі быў адным з самых арыгінальных — нічога падобнага мы раней не бачылі: у папраўчай калоніі 20-гадовы Даніэль перажывае духоўнае ператварэнне, знаходзіць разуменне ў ксяндза Томаша і хоча стаць святаром. Але з-за судзімасці гэта немагчыма, і хлопца адпраўляюць на папраўчыя работы ў маленькі гарадок, дзе Даніэль выдае сябе за пастара. З'яўленне ў правінцыйным прыходзе маладога ксяндза змяняе жыццё горада, мясцовыя жыхары палюбілі ўчарашняга злачынцу і з яго дапамогай пазбавіліся калектыўнай траўмы. Але гульня ў пастара, якая зацягнулася, не можа працягвацца доўга, падман неўзабаве адкрываецца. І тут цікава, як выходзяць з недарэчнай сітуацыі ўсе яе ўдзельнікі? Выканаўца ролі Даніэля — польскі акцёр Барташ — заслугоўвае асобнай увагі. Моцная праца. За адзін толькі пранізлівы позірк ён лёгка б мог прэтэндаваць на асобны прыз ад журы.

Увогуле, фестываль сёлета атрымаўся вельмі эмацыянальны і крыху незвычайны. Напэўна, паўплывала вялікая колькасць фільмаў і іх жанравая разнастайнасць. Як адзначыў Ігар Сукманаў, «Лістапад», несумненна, стаў часткай жыцця беларусаў. Сёння фестываль нельга назваць толькі клубам для інтэлектуалаў, гэта вялікая пляцоўка для разваг абсалютна любога гледача:

— Фестываль — правадыр у свет добрага густу. Ён змяняецца, працэс гэты прыкметны не адразу, нават з вышыні гадоў. Калі мы пачыналі 10 гадоў таму, кінатэатральная палітыка была крыху іншая. Тады маглі з'яўляцца праграмы, калі падчас уік-энду дэманстраваліся фестывальныя фільмы. Зараз жа ў пракатнай сетцы яны суседнічаюць з іншымі і дэманструюцца не адзін-два дні, а паўнавартасны тыдзень ці два. Гэта становіцца часткай нашай культуры, жыцця. Можа быць, хацелася б нейкіх вялікіх заваёў. Але нават у нашага фестывалю цяпер узнікаюць пэўныя складанасці з атрыманнем работ. Але мы заваяваралі аўтарытэт, і па арганізацыі паказаў на «Лістападзе» не ўзнікае амаль ніякіх пытанняў.

XXVI Міжнародны кінафестываль «Лістапад» ужо адгучаў, але ж гэта сведчыць не пра адпачынак альбо канец, а пра пачатак плённай падрыхтоўкі да наступнага фестывалю.

Вікторыя АСКЕРА

Пераплысці раку, пераапрануцца ў касцюм і паслухаць джаз

5 фестываляў да канца года, якія прыйдуцца даспадобы аматарам любой культуры

1. **Бярэзіна-2019.** З 23 па 24 лістапада на Брылёўскім полі пройдзе фестываль гістарычнай рэканструкцыі. Перанесціся ў эпоху Напалеона і пабачыць парад узору XIX стагоддзя — тое, дзеля чаго аматары мінуўшчыны традыцыйна з'язджаюцца ў Барысаўскі раён. Менавіта пасля няўдалай пераправы праз Бярэзіну каля барысаўскіх вёсачак Студзенка і Брылі армія французскага імператара перастала існаваць, а мясцовасць назаўжды застался ў падручніках па гісторыі. Арганізатары і сёлета абяцаюць насычаную праграму, якую дапоўніць французскі бок: чакаецца прыезд ваеннага аркестра парашутнага палка з Тулузы, і ўжо на 22 лістапада запланаваны іх канцэрт у гарадскім Палацы культуры. Асноўныя падзеі адбудуцца не толькі ў гістарычным комплексе «Брылёўскае поле», але і на вуліцах Барысава: там пройдзе парад уніфармістаў, удзельнікаў клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі з Расіі, Польшчы і іншых краін (ужо зарэгістравалася больш як 500 удзельнікаў). Будуць рэканструяваць бой «Батарэі», а пасля перасякаць Бярэзіну ўплаў. Гэта ідэя французскага боку, які пажадаў паўтарыць учынак французскіх пантанёраў. Узяць удзел у заплыве зможа кожны пры ўмове запаўнення заяўкі на сайце Беларускай федэрацыі загартоўвання і спартыўнага зімовага плавання. Цікавая праграма гэтымі днямі будзе і ў гарадскім Палацы культуры, дзе пройдзе грамадскі баль напалеонаўскай эпохі і монаспектакль па лісце Поля Анры дэ Клемена свайму сыну «Вялікая гісторыя маленькага гузіка». А супрацоўнікі Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева пазнаёмяць з адмысловай мемарыяльна-выставачнай эскпазіцыяй, якую складаюць артэфакты, кніжная калекцыя, карціны, сувеніры, карты і г. д.

2. **Фестываль сучаснай маладзёжнай усходнеазіяцкай культуры EW14.** 23 лістапада ў Мінскім гарадскім палацы культуры ў межах фестывалю «Японская восень у Беларусі» адбудзецца штогадовае свята аматараў анімацыі, коміксаў, камп'ютарных гульняў, вулічнай моды і музыкі, якое праходзіць з 2006 года. Яго асноўная ідэя — дапамагчы моладзі рэалізаваць сябе, развіць творчы патэнцыял, знаёмячыся і вывучаючы сучасную папулярную культуру Японіі, Паўднёвай Карэі, Кітая і іншых краін. Фестываль традыцыйна складаецца з дэфіле-выступаў, танцавальных і песенных кавераў, сцэнічных пастановак і мініяцюр, выстаўкі малюнкаў, фатаграфій, інсталяцый з шарнірнымі лялькамі, кірмашу з продажам касплэй-тавараў, сувеніраў, упрыгожванняў, кніг і коміксаў. Таксама будзе адкрыта гульнёвая зона з настольнымі гульнямі і кансолямі. Падчас свята адбудзецца і Pro-адбор у фінал міжнароднага конкурсу касплэя «*Eurocosplay*» ў Лондане. Пляцоўка касцюміраванага фестывалю традыцыйна аб'ядноўвае ўсіх аматараў кірунку сучаснай усходнеазіяцкай культуры, што жывуць у Беларусі.

3. **JAZZinMinsk-2019.** VIII Міжнародны джазавы фестываль пройдзе з 28 лістапада па 1 снежня ў Палацы Рэспублікі (джаз-клуб) і ў Палацы прафсаюзаў. Заснавальнік фестывалю — маэстра беларускага джаза — дыпламант ЮНЕСКА Яўген Уладзіміраў — збірае сусветных джазавых зорак з ЗША, Нідэрландаў, Францыі, Латвіі, Англіі і Расіі. Упершыню ў Мінску выступяць выдатны саксафаніст з Нью-Ёрка Джэсі Дэвіс і вакалістка з Парыжа Ава Цімба. Сусветным зоркам будзе акампаніраваць *Anderson-trio* (Лондан — Рыга), у складзе якога — піяніст з Лондана Аціс Андэрсан, барабаншчык Андрыс Буйкіс і кантрабасіст Норберт Скраўсіс з Рыгі. Праграма канцэрта ўключае шэдэўры джаза XX—XXI стагоддзяў, створаныя Элай Фіцджэральд, Дзізі Гілеспі, Бенні Голсанам, Мілтам Джэксанам, Нікаласам Пэйтанам, Уінтанам Марсалісам, Рэям Браўнам, з якімі працаваў Джэсі. У астатнія дні выступяць Доры Лін Лайлз і Мішэль Дэніз & *Sugar Queen* (вакал, ЗША), Сауэта Кінч (саксафон, Англія), *Madars Quartet* (Латвія — Англія), Грэг Кофі Браўн (вакал, Англія), Кліўленд Уоткіс (вакал, Англія), квартэт «Зоркі пецярбургскага джаза» (Расія), Джасаі Вудсан (труба, ЗША) і іншыя.

4. **Калядны оперны форум.** З 12 па 18 снежня ў Вялікім тэатры Беларусі адбудзецца юбілейны X Мінскі міжнародны Калядны форум. Адной з найярчэйшых падзей стане паказ спектакля «Севільскі цырульнік» Джаакіна Расіні, які прадставяць артысты Нацыянальнай оперы Украіны (дырыжор Ала Кульбаба). У сёлетнім сезоне тэатр прадставіць гледачам гала-канцэрт з удзелам лаўрэатаў і ўладальнікаў Гран-пры мінулых гадоў — гэта 30 выканаўцаў, зорак сусветнай велічыні, якія працуюць у Марыінскім, Міхайлаўскім, Ерэванскім, Сафійскім, Эстонскім і іншых тэатрах. Дырыжор — Джанлука Марчана. Дарэчы, сёлета змяняецца фармат Каляднага конкурсу вакалістаў: ён будзе праводзіцца адзін раз на два гады. Вялікі тэатр Беларусі на працягу многіх гадоў збірае на сваёй сцэне прызнаных зорак опернай сцэны і запрашае гледачоў паглядзець не толькі новыя пастаноўкі, але і найлепшыя спектаклі гэтага і мінулых сезонаў і фестывальныя прэм'еры самых розных оперных жанраў. Сярод чаканых пастановак — «Князь Ігар» (дырыжор Аляксандр Анісімаў), «Кажан» (дырыжор Іван Касцяхін), «Кармэн» (дырыжор Андрэй Галанаў) і «Турандот» (дырыжор Алег Лясун).

Мінулагодняя афіша.

5. **«Славянскія тэатральныя сустрэчы».** З 3 па 7 снежня ў Гомелі адбудзецца XIV Фестываль тэатральнага мастацтва «Славянскія тэатральныя сустрэчы», які ўпершыню прайшоў яшчэ ў 1983 годзе. За гады існавання фэст прымаў вядучыя тэатральныя калектывы з Мінска, Кіева, Санкт-Пецярбурга, Масквы, Кішынёва, Адэсы, Кракава, Вільнюса і іншых гарадоў замежжа. Цэнтрамі фестывалю ў розны час былі Гомель, Бранск і Чарнігаў. Дэвіз сёлетняга форуму — «Тэатр як свята». Спектаклі пройдуць на чатырох сцэнічных пляцоўках: Гомельскага аблдрамтэатра, гарадскога маладзёжнага тэатра, Дзяржаўнага тэатра лялек і гарадскога Цэнтра культуры. Мэта — падтрымка традыцый і знаёмства з новымі тэндэнцыямі айчыннага тэатра, шэдэўрамі сусветнай і нацыянальнай мастацкай спадчыны. Акрамя паказу спектакляў, праводзяцца творчыя сустрэчы, майстар-класы, прэс-канферэнцыі і тэматычныя круглыя сталы. Адкрые форум выступленне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Галоўны драматычны тэатр рэспублікі прывязе «Рэвізора». Усяго ў конкурснай праграме заяўлена каля дзясятка спектакляў: са сваімі пастаноўкамі пазнаёмяць Бранскі тэатр драмы імя А. К. Талстога (Расія), Чарнігаўскі абласны акадэмічны ўкраінскі тэатр імя Т. Р. Шаўчэнкі (Украіна), Таганрогскі тэатр імя А. П. Чэхава (Расія), упершыню — Тбіліскі тэатр юнага гледача (Грузія). Сярод беларускіх удзельнікаў заяўлены тэатральны праект *HomoCosmos* (Мінск), Мазырскі драматычны тэатр імя І. Мележа і іншыя. Дарэчы, спектакль «Белая сарока» Тбіліскага тэатра юнага гледача пастаўлены па матывах кнігі Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» вядучым беларускім рэжысёрам, мастацкім кіраўніком дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача Уладзімірам Савіцкім. На фестывалі будуць працаваць міжнароднае журы і тэатральныя крытыкі з розных краін: Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы і Грузіі.

Мінулагодняя афіша.

Матэрыялы старонкі падрыхтавала Яўгенія ШЫЦЬКА

Скарбонка Спадчыны

Фота Паўла Бакушава.

З паяском праз жыццё

Унікальнымі валожынскімі вырабамі можна падвязваць сукенкі, упрыгожваць валасы і не толькі…

Адметная тэхналогія ткацтва паясоў «на ніту» (у Валожынскім раёне — «на назе») раней была распаўсюджана па ўсёй краіне. Але менавіта на Валожыншчыне, а дакладней у аграгарадках Сакаўшчына і Ракаў, носьбіты ўнікальнага майстэрства — Марыя Стасяловіч і Хрысціна Лямбовіч — змаглі паспяхова адрадзіць ды захаваць для новых пакаленняў адмысловую традыцыю. У 2016 годзе гэты элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны быў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Марыя Стасяловіч адрадзіла ткацтва паясоў «на ніту», але тры гады таму сышла ў нябыт. Пакуль хапала сіл, нягледзячы на свае дзевяноста, з задавальненнем перадавала досвед і веды, праводзіла майстар-класы і дома, і ў Сакаўшчынскім сельскім Цэнтры культуры.

У сваю чаргу Хрысціна Лямбовіч, дырэктар Ракаўскага цэнтра народнай творчасці, якая пераняла непасрэдна «з рукі» тэхналогію ад Марыі Мікалаеўны, кіруе гуртком «Ткачыкі» і таксама дзеліцца досведам з юнымі ткачамі, ладзіць майстар-класы. Паясы Хрысціны Станіславаўны выкарыстоўваюцца ў вясельных і радзінных абрадах, як сувенірная прадукцыя.

— Валожынскія паясы нагадваюць стракатыя ўзорыстыя «тасёмкі», шырыня якіх не перавышае двух сантыметраў, — распавядае Хрысціна Лямбовіч. — Раней у асноўным выкарыстоўвалі ніткі хатняй работы. За аснову бралі кужоўныя ніткі, на больш грубыя паясы ішлі зрэбныя. Ільняныя звычайна адбельвалі, фарбавалі рэдка. Узор ткаўся з нітак суконных, спрадзеных з авечай воўны, якую афарбоўвалі натуральнымі фарбавальнікамі. Выкарыстоўвалі кару дуба, шалупінне цыбулі і іншае. У валожынскіх паясах, як і наогул у беларускіх, пераважалі адценні чырвонага, барвовага, белага або шэрага. Дапаўненнем служылі ніткі чорнага, зялёнага, жоўтага, фіялетавага, сіняга колераў.

Мэта Ракаўскага цэнтра народнай творчасці — захаваць дакладна традыцыю ткацтва: узоры, каларыстыку, назвы, абрады, звязаныя з поясам, і г. д. і перадаць будучым пакаленням. Дарэчы, дасведчаную майстрыху, падкрэсліла Хрысціна Станіславаўна, вылучаюць характэрныя пстрычкі. Пояс атрымліваецца дакладны — шчыльны, роўненькі. Але, як і ў любым рамястве, ткацтвам займаюцца самыя цярплівыя.

— Пояс суправаджаў нашых продкаў ад нараджэння да самай смерці, — заўважае Хрысціна Станіславаўна. — Немаўлят абвязвалі, каб яны былі спакойныя, а ножкі — роўныя. Калі пояс развязваўся, у народзе казалі, што чалавек «распаясаўся» і паводзіць сябе неадпаведна сітуацыі, вольна. Калі маладая дзяўчына збіралася замуж, ёй трэба было выткаць каля 100 паясоў. Бабулі перадавалі сваё майстэрства ўнучкам, таму дзяўчынкі ўжо ў 8—10 гадоў нацягвалі ніткі і замацоўвалі іх на нагах, што дазваляла ткаць паясы нават у полі, калі пасвілі кароў.

Традыцыі ткацтва паясоў «на ніту», здаецца, ужо не пагражае знікненне. Цяпер на Валожыншчыне дзеці вучацца ствараць унікальныя вырабы не толькі ў Ракаве, але і ў Доме культуры аграгарадка Сакаўшчына, дзе створаны пакой-музей традыцыйных паясоў.

Аднак для паспяховага захавання ўнікальнай тэхналогіі гэтага мала, лічаць эксперты. Між іншым, паясы і сёння могуць выконваць функцыі як дэкаратыўныя, так і практычныя. Скажам, імі можна падвязваць сучасныя сукенкі, насіць са штанамі, упрыгожваць валасы, выкарыстоўваць у якасці закладак для кніг і інш.

— Як носьбіты адмысловай традыцыі, мы з пашанай і гонарам ставімся да таго, што засталося ад продкаў, бо тэхналогія ткацтва паясоў — важная частка мясцовай культуры, якую трэба захоўваць і перадаваць нашчадкам, — упэўнена Хрысціна Лямбовіч. — Так прыемна назіраць за радаснымі тварамі юных майстроў пасля таго, як з-пад іх рук з'явіўся першы пояс! Быццам узнікла нябачная сувязь з далёкімі родзічамі.

Раіса МАРЧУК

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснік галоўнага рэдактара — 377-99-72
адказны сакратар — 377-99-72
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 377-99-72
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
21.11.2019 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 942

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 3776

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.